незалежная газета

№ 28 (626) 29 ліпеня 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Расійскія нацысты пагражаюць смерцю беларускай блогерцы**

Старонка 6

**Патопы стануць частымі**

Старонка 8

**Гісторыя Беларусі**

Старонка 11

**У НУМАРЫ**

**Ні даляра насельніцтву**

Валютных крэдытаў фізічным асобам не дадуць, а валютныя крэдытныя карткі заблакуюць. Нацбанк працягвае дэдалярызацыю эканомікі. **Старонка 4.**

**У Лукашэнкі нарадзілася ўнучка**

Для Ліліі Лукашэнка падрыхтавалі спецыяльныя палаты ў звычайнай радзільні. **Старонка 9.**

**Хрусталёў меў дзве сям'і**

Каб падвесці рысу пад мінулым жыццём, ён пераехаў у Маскву. **Старонка 9.**

**Богу — Богава, а маладафронтаўку здалі міліцыі**

Інцыдэнт здарыўся падчас малітоўнай сустрэчы каталіцкай моладзі ў Івянцы. **Старонка 3.**

**Міхалок сыграе пярэваратня?**

На «Беларусьфільме» адбываецца кастынг актораў для новай стужкі Андрэя Кудзіненкі «Масакра». **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Пратэктарат Беларусь

«Нават такі поўны пратэктарат Расіі як Беларусь устаў на дыбкі ад [палітыкі] Масквы», — гэткай адзінай фразай згадаў нашую краіну віцэ-прэзідэнт ЗША Джо Байдэн. **Старонка 5.**



MASSIMILIANO CLAUSI

**27 ліпеня споўнілася 19 гадоў з дня прыняцця Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі.**



**Маршруты па Беларусі:**

**у сэрцы Вялікай Літвы**

**Старонка 13.**

# Еўрасаюз з крэдытам не спяшаецца

**Міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў другі раз цягам году наведаў Брусэль. І зноў — для сустрэчы з «еўратройкай».**

28 ліпеня ў бельгійскай сталіцы міністр сустракаўся з вярхоўным камісарам замежнай палітыкі і палітыкі бяспекі Хаўерам Саланам, еўракамісарам у пытаннях палітыкі добрасуседства і пашырэння Бенітай Ферэра-Вальднэр і міністрам замежных справаў Швецыі Карлам Більдтам. Швецыя сёлета старшынюе ў саюзе 27 незалежных дзяржаваў.

Па завяршэнні перамоваў удзельнікі адказалі на пытанні журналістаў. Б.Ферэра-Вальднэр адзначыла, што Еўрасаюз гатовы падтрымліваць Беларусь, калі нашая краіна «прадэманструе сур'ёзны рух у кірунку дэмакратыі і фундаментальных свабод».

Еўрасаюз не зусім задаволены станам рэчаў у Беларусі. К.Більдт зазначыў, што сітуацыя ў Беларусі на сёння «не адпавядае чаканням». «Беларускія ўлады могуць і ў прынцыпе павінныя зрабіць больш для ўмацавання адносін з ЕС», — дадаў ён.

У верасні Еўрасаюз пачне вывучаць сітуацыю ў Мінску па пяці асноўных пунктах (адсутнасць палітвязняў, свабода СМІ, змены выбарчага заканадаўства, паляпшэнне працы недзяржаўных арганізацый і свабода сходаў). Па выніках і будзе вырашана, ці працягваць санкцыі супраць беларускіх чыноўнікаў.

ЕС асабліва падтрымае «паляпшэнне якасці беларускіх прадуктаў, бо гэта важна для беларусаў, каб яны маглі экспартаваць прадукты ў Еўрасаюз», — зазначыла Ферэра-Вальднэр, адказваючы на пытанне пра эканамічнае супрацоўніцтва.

Што датычыць наўпроставай грашовай дапамогі ЕС, то еўракамісарка сказала, што гэта «можа адбывацца па лініі МВФ».

Улічваючы, што 19 ліпеня прадстаўнікі МВФ заявілі, што Мінск не мае патрэбы ў дадатковым замежным фінансаванні, гэта азначае адмову Мінску ў яго просьбе .

Ферэра-Вальднэр сказала, што ЕС можа шмат чаго прапанаваць Беларусі ў сферы макраэканомікі, энэргетыкі, гандлю. Аднак развівацца далейшым адносінам замінае няўпэўненасць еўрапейцаў, што ў Беларусі адбываюцца незваротныя рэформы.

«І Беларусь, і ЕС разлічваюць, што кожны з бакоў будзе з большай хуткасцю ісці насустрач чаканням іншага», — адказаў на гэта Мартынаў. Ён акцэнтаваў пытанне дарагавізны візаў. Ягоны шведскі калега парыраваў, што гэтае пытанне залежыць ад волі беларусаў.

Нежаданне ЕС выдзяляць крэдыт лукашэнкаўцам азначае, што фінансавая сітуацыя ў Беларусі да канца году будзе заставацца нестабільнай. Далейшая дэвальвацыя рубля не выключаная.

**Зміцер Панкавец**

# «Белсаюздрук» адмовіў «ARCHE» ў распаўсюдзе

Рэдакцыя часопіса «ARCHE» атрымала ліст за подпісам дырэктара РУП «Белсаюздрук» Ігара Дудзіча, у якім зазначаецца, што цяпер «адсутнічае магчымасць распаўсюджання часопіса праз гандлёвую сетку з прычыны надзвычай высокай яе насычанасці перыядычнымі выданнямі, у тым ліку масава-палітычнай і літаратурна-мастацкай тэматыкі».

У канцы чэрвеня рэдакцыя «ARCHE» разам з шэрагам незалежных выданняў атрымала ліст за подпісам старшыні Грамадскай каардынацыйнай рады ў сферы СМІ Паўла Якубовіча.

У лісце паведамлялася, што па выніках паседжання 4 чэрвеня Рада «прыняла рашэнне рэкамендаваць кіраўніцтву гандлёвага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства <...> вярнуцца да разгляду пытанняў, звязаных з распаўсюдам прадукцыі ўказанага сродку масавай інфармацыі». Рэдакцыя часопіса накіравала зварот да кіраўніцтва «Белсаюздруку» з просьбай аднавіць распаўсюд выдання.

Галоўны рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў мяркуе, што ў сітуацыі з незалежнымі сродкамі інфармацыі адбываюцца мінімальныя змены, бо да гэтага часу застаюцца няроўныя ўмовы для распаўсюду прэсы.

Вольга Жарнасек



**Пытайцеся ў аддзяленнях «Белпошты»**

# Новая кніга ў серыі «Кнігарня «Наша Ніва»




**Анджэй Суліма Камінскі «Рэспубліка супраць аўтакратыі. Рэч Паспалітая і Расія ў 1686—1697 гадах».**

Гэта быў перыяд зацішша, нічога не мянялася на ўсходзе Еўропы. Але тое было зацішша перад бурай, калі адны бяздарна гублялі шанцы, а другія паслядоўна рыхтавалі змену ў балансе сілаў.

Адкрытае грамадства супраць закрытага. Шматнацыянальнае — супраць ксенафобскага. Давід у саюзе з Галіяфам супраць другасных ворагаў. Вольны дух Рэспублікі супраць бязлітаснай машыны тыраніі — у навуковым бэстсэлеры прафесара Джорджтаўнскага універсітэту Анджэя Сулімы Камінскага.

Аўтар нарадзіўся ў Кракаве ў 1935 годзе, але правёў маленства ў Навагрудку, дзе яго дзед працаваў доктарам-псіхіятрам. Суліма Камінскі — адзін з самых аўтарытэтных спецыялістаў па гісторыі Рэчы Паспалітай у свеце. Яго кніга бліскуча тлумачыць механізм функцыянавання дзяржавы палякаў, беларусаў, украінцаў, літоўцаў — сакрэт яе стойкасці, дзякуючы якому яна стагоддзямі вытрымлівала націск мацнейшых суседзяў.

Беларуская стала першай са славянскіх моваў, на якую перакладзеная гэтая кніга.

## СЦІСЛА

### Рубель узмацняецца проці даляра

Новы курс амерыканскай валюты — 2800 рублёў. Яшчэ два тыдні курс Нацбанку дасягаў 2882 рублёў — амаль на 3% больш. Суадносіны еўра і даляра дасягнулі рэкорду за год —1,43. На сусветных таргах прапорцыі такія самыя.

### Чырвоны касцёл у Мінску зменіць выгляд

Храм паўстане ў новым антуражы. Касцёл будзе стаяць на велічным пастаменце, з мноствам прыступак. Яны будуць узыходзіць з трох бакоў, звернутых да плошчы Незалежнасці. Зменіцца расстаноўка скульптураў вакол храму. Помнікі падпольшчыку Амельянюку, скульптура арханёла Міхаіла перамесцяцца, вызваліцца месца пад будучы помнік Яну Паўлу II. Цалкам знікне і сцяна, якая адасабляе касцёл ад плошчы Незалежнасці, — тут будуць зробленыя прыступкі. Такім чынам, храм будзе ўзвышацца над зямлёй.

### Крымінальны вышук выявіў банду ў сталіцы

Заведзеная крымінальная справа па артыкуле 286 КК «Бандытызм» у адносінах да 8 чалавек. Затрыманыя сямёра. З 1998 па 2000 год яны здзейснілі забойства, шэраг нападаў і крадзяжоў.

### Адмоўнае сальда — $3,9 млрд

Адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі вырасла ў 1,8 разу проці першага паўгоддзя 2008-га. За чэрвень дэфіцыт вырас на 733 млн.

### Бел-чырвона-белыя сцягі ў Салігорску, Лідзе, Маладзечне

Рэгіянальныя актывісты грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» правялі акцыі, прысвечаныя Дню незалежнасці. Нацыянальныя сцягі з'явіліся ў Салігорску каля гатэля «Алеся», на плошчы Леніна ў Маладзечне і ў Лідзе на вуліцы Рыбіноўскага.

### Лукашэнка наняў «фатографа каралёў і прэзідэнтаў»

Стала вядома, што найбліжэйшым часам з ім будзе працаваць вядомы на ўвесь свет фотамастак Саша Гусаў. Лічыцца, што партрэт ад Гусава — сімвал прэстыжу. Інфармацыя пра тое, што ў найбліжэйшы час Гусаў будзе працаваць з Лукашэнкам, прагучала ў Маскве на вечарыне-прэзентацыі экалагічнага фотапраекту.

Гусаў — дарагі фатограф, які здымаў Ксенію Сабчак і Ціну Кандэлакі.

**БЕЛТА; ЯМ; Еўрапейскае радыё для Беларусі; ВЖ; Радыё Свабода; f-fight.org; Салідарнасць**

# Не ўсё ў жыцці ў апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй

## за ахвяраванні

Алесю Н. са Слуцкага раёну
Соф'і Я., Міхаілу З., Іраідзе З., Л.Л., Вользе П., В.Я.П., В.М.П., Д.К., Юрыю Л., Леаніду Г., А.Р., Рыце Н., Наталлі М., А.А., Генадзю К., А.К., Н.Б., С., А.С., В.Ц. з Мінску
Уладзіміру Л. з Маладзечна
Валянціне А., Святаславу Г. з Талочынскага раёну
Уладзіміру Я., Юліі І. з Барысава
Антону Т. з Жодзіна
А.А. з Полацку
Сяргею Т. з Лідскага раёну
Андрэю К. з Глыбоцкага раёну
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёну
Андрэю Б. са Шчучына
Мікалаю Ш. з Салігорску
В. з Бабруйскага раёну.
В.М. з Брэста.
Ірыне З. з Смалявіцкага раёну.
С.К. з Гродна.
Андрэю А. з Мінскага раёну.

# Богу — Богава, а маладафронтаўку здалі міліцыі

**Інцыдэнт здарыўся падчас малітоўнай сустрэчы каталіцкай моладзі ў Івянцы.**

Каталіцкія актывісты-дружыннікі затрымалі і аддалі міліцыі маладафронтаўку Насту Палажанку, якая раздавала буклеты па гісторыі бел-чырвона-белага сцягу і гербу «Пагоня».

Палажанка кажа, што раздавала буклеты хвілін 20-30, пасля чаго да яе падышлі каля дзесяці ахоўнікаў, якія зацікавіліся друкаванымі матэрыяламі і папрасілі паказаць сумку. Наста адмовілася, пасля чаго яе адвялі да міліцыянтаў. Дзяўчыну адвезлі ў пастарунак, адкуль праз пару гадзін вызвалілі без складання пратаколу.

«У буклеце пра палітыку ні слова. Калі я прапанавала маладзёнам паглядзець змест буклету, яны адмовіліся», — кажа Н.Палажанка.

Адзін з арганізатараў малітоўнай сустрэчы — пробашч парафіі Маці Божай Будслаўскай у Кунцаўшчыне айцец Аляксандр Пісарук **(на фота — справа)** трымаецца іншае думкі. «Была просьба не перашкаджаць сустрэчу ў палітычную акцыю. Усе мы ведаем, у якой сітуацыі знаходзімся. Была размова нават аб закрыцці мерапрыемства. Каму б ад гэтага было добра?» — кажа а.Аляксандр Пісарук, але зазначае, што гэта ягонае прыватнае меркаванне, а не погляд Касцёлу.

«Хлопцы, якія затрымалі Палажанку, проста разгубіліся. Разам з тым, у мяне шмат нараканняў. БХД выкарыстоўвае імёны святароў у сваіх мэтах, без іх згоды. У прыватнасці, я гавару пра сябе. Касцёлу не супярэчыць ні адзін, ні другі сцяг, але раздаваць буклеты са словамі, што гэта сцяг Хрыста, мякка кажучы, абсурдна», — гаворыць святар.

Сустаршыня БХД Павел Севярынец расказвае, што ў яго таксама ўзніклі праблемы на сустрэчы. «На падыходзе да Івянца мяне спынілі гэтыя хлопцы-ахоўнікі і сказалі, каб я зняў значак з выявай Пагоні. На гэта я адказаў, што гэта афіцыйны герб Віцебскай вобласці. Адзін з дружыннікаў сказаў, што чуў пра тое, што Лукашэнка вярнуў Пагоню, але трэба патэлефанаваць даведацца. Не ведаю, ён званіў Лукашэнку ці каму так. Але ў гэты час я вольна прайшоў на месца сустрэчы», — расказвае П.Севярынец.

Летась у Івянцы таксама былі затрыманні. Затрымлівалі актывіста БХД Кастуся Шыталя за распаўсюд... моладзевага каталіцкага выдання «Промень». Толькі тады затрымлівалі міліцыянты, цяпер арганізатары сустрэчы. Вырашылі падстрахавацца.

Малітоўная сустрэча ў Івянцы стала традыцыйнай. Сёлета, нягледзячы на дажджы, на ўскраек Налібоцкай пушчы з'ехалася 900 юнакоў і дзяўчат.

**Зміцер Панкавец**



# Саакашвілі сказаў дзякуй

**Беларусь забараніла сваім грамадзянам уязджаць у Абхазію з боку Расіі. Расія адказала злоснымі намёкамі.**

Мінулы тыдзень зноў прайшоў на фоне беларуска-расійскіх супярэчнасцяў. Рассельгаснагляд увёў абмежаванні на пастаўку ў Расію прадукцыі ААТ «Гомельскі мясакамбінат» і ААТ «Брэсцкі мясакамбінат» за наяўнасць у прадукцыі антыбіётыкаў. На гэта беларускі бок на некалькі дзён прыпыніў эксплуатацыю свайго ўчастку нафтаправоду «Унеча—Вентспілс».

А 22 ліпеня МЗС Беларусі «настойліва рэкамендавала» беларусам улічваць палажэнні грузінскага заканадаўства, плануючы паездкі ў Абхазію і Паўднёвую Асецію.

«Уезд замежных грамадзян у Абхазію і Паўднёвую Асецію дапускаецца выключна з напрамкаў Зугдідскага і Гарыйскага муніцыпалітэтаў. Пранікненне ў Абхазію і Паўднёвую Асецію з усіх іншых напрамкаў без спецыяльнага дазволу грузінскіх уладаў забараняецца і караецца ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Грузіі», — паведамляла прэс-служба МЗС.

Прамаўляючы ў парламенце, грузінскі прэзідэнт Міхаіл Саакашвілі выказаў падзяку беларускаму боку. «Такое рашэнне Беларусі з'яўляецца смелым крокам», — заявіў грузінскі лідэр. Ён адзначыў, што Беларусь стала першай краінай, якая выступіла з падобнай заявай, і гэтую ініцыятыву павінныя падтрымаць у свеце.

Зрэшты, беларускі МЗС быў вымушаны неяк змякчаць заяву. Начальнік консульскага аддзелу міністэрства Андрэй Гіро сказаў, што МЗС «азадачанае рэакцыяй на заяву». «Тут няма ніякай палітыкі, гэта тлумачыцца клопатам пра грамадзян», — сказаў А.Гіро.

У чацвер Лукашэнка правёў нараду з прадстаўнікамі замежных установаў Беларусі. Сярод іншага ён закрануў і пытанне стасункаў з Расіяй. Кіраўнік дзяржавы зазначыў, што супярэчнасці з Расіяй з'яўляюцца ўсё больш часта і робяцца ўсё больш вострымі, за якімі часам прасочваюцца паслядоўнасць і сістэмнасць. Паводле яго словаў, з беларускага боку гэта выклікае трывогу, а часам боль і расчараванне. Лукашэнка прапанаваў пабудаваць паміж Беларуссю і Расіяй унікальныя стасункі як між новымі незалежнымі дзяржавамі.

У Маскве гэтыя заявы спадабаліся далёка не ўсім. Пятнічны «Камерсант» выйшаў з загалоўкам «Крэмль абяцае Лукашэнку праблемы з грашыма». «Незразумела, дзе ён збіраецца браць грошы на сваю змену курсу. Асабліва калі прыйдзе час плаціць пенсіі і заробкі», — піша выданне.

Першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч на гэта зазначыла, што пагрозы ананімаў у адрас Беларусі выглядаюць недарэчнымі. «Кіраўнік дзяржавы на гэтым тыдні неаднаразова заяўляў, што Беларусь лічыла і лічыць Расію сваім галоўным саюзнікам і зацікаўленая ў замацаванні яе эканамічнага патэнцыялу і міжнародных пазіцый. На гэтым фоне пагрозы нейкіх ананімаў у адрас Беларусі сталі ўжо дурной практыкай», — зазначыла Н.Пяткевіч.

**ЗП**

# Місія эксперта Фінке

У справе Мікалая Аўтуховіча з'явіўся новы паварот. Стала вядома, што ў Мінск з экспертызай прыязджаў нямецкі эксперт Марцін Фінке.

У Беларусі прафесар універсітэту Пасаў (Ніжняя Баварыя) знаходзіўся 9—10 ліпеня. Пасля гэтага ў пасольствы еўрапейскіх краін пайшлі заключэнні, што ў справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў усё законна.

У тэлефонным інтэрв'ю карэспандэнту «НН» Марцін Фінке паведаміў, што ў Мінску знаходзіўся па запрашэнні офісу АБСЕ, з ім асабіста кантактаваў пасол Ханс-Ёхан Шміт.

Ні з Аўтуховічам, ні з адвакатам яго Фінке не сустракаўся. «Урад, наколькі я ведаю, папрасіў запрасіць міжнароднага спецыяліста, і яны запрасілі мяне. Яны прывезлі мяне ў Міністэрства ўнутраных справаў для сустрэчы з тымі, хто расследуе гэтую справу. І я даў экспертнае заключэнне. Яны мне ўсё расказалі і адказалі на ўсе пытанні. Мне паказалі ўсе матэрыялы, якія мяне цікавілі. Я быў абмежаваны той інфармацыяй, якую мне давалі следчыя, і пададзенымі дакументамі», — сказаў М.Фінке.

Адвакат Аўтуховіча Павел Сапелка назваў прадстаўленне матэрыялаў справы нямецкаму эксперту «абуральнай беззаконнасцю».

**Зміцер Панкавец, Сяргей Богдан**

## СЦІСЛА

### Лукашэнка павіншаваў Чавэса з днём народзінаў

Прэзідэнту Венесуэлы 28 ліпеня споўнілася 55 гадоў. Роўна столькі будзе і Лукашэнку 30 жніўня.

### Дашкевічу не падабаецца «Белоруссия»

Лідэр «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч звярнуўся ў рэдакцыі газет «Комсомольская правда» в Белоруссии», «Аргументы и факты» в Белоруссии», «СБ: Советская Белоруссия — Беларусь сегодня» і ў дыпламатычныя місіі замежных краін у Беларусі з просьбай правільна ўжываць назву краіны.

### 19 гадоў незалежнасці

27 ліпеня 1990 году Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце. Яшчэ праз месяц, 25 жніўня 1991 году, Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце атрымала статус канстытуцыйнага закону.

### Яшчэ адзін смяротны прысуд

Суд Мінскай вобласці 22 ліпеня вынес вырак забойцам работнікаў СВК «Бальшавік Агра» (Салігорскі раён). Адзін са злачынцаў асуджаны на смяротнае пакаранне, другі — да пажыццёвага зняволення. 23 чэрвеня Парламенцкая асамблея Савету Еўропы прыняла рашэнне, што Беларусі будзе вернуты статус спецыяльна запрошанай у арганізацыі толькі пасля ўвядзення мараторыю на смяротнае пакаранне. Тым не менш, гэта ўжо другі смяротны прысуд, вынесены ў Беларусі пасля паседжання ПАРЕ.

### Бухвостаў аднаўляе Партыю працоўных

26 ліпеня ва ўправе Партыі БНФ прайшоў устаноўчы з'езд Беларускай партыі працоўных. Гэта рэінкарнацыя Беларускай партыі працы, якая была ліквідаваная ў 2004 годзе. Як і тую партыю, новую структуру ўзначаліў Аляксандр Бухвостаў, а ягонымі намеснікамі сталі Мікалай Пахабаў і Андрэй Еўдакімовіч. Гасцямі на з'ездзе былі лідэр ПКБ Сяргей Калякін, старшыня сацыял-дэмакратаў Анатоль Ляўковіч, экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Уладзімір Ганчарык. Так вымалёўваецца адна з кааліцый на наступныя прэзідэнцкія выбары.

На сёння ў краіне налічваецца шэсць сацыял-дэмакратычных партый — дзве зарэгістраваныя і чатыры аргкамітэты.

**ЗП**

# Ні даляра насельніцтву

**Валютных крэдытаў фізічным асобам больш не дадуць, а валютныя крэдытныя карткі заблакуюць. Нацбанк працягвае дэдаларызацыю беларускай эканомікі.**

Нацбанк Беларусі ўвёў забарону на выдачу крэдытаў фізічным асобам, акрамя індывідуальных прадпрымальнікаў. З 28 ліпеня беларусы змогуць атрымліваць крэдыты толькі ў рублях. Нацбанк абгрунтоўвае прынятае рашэнне клопатам пра саміх грамадзян: «Крэдытаванне насельніцтва ў замежнай валюце ўтрымлівае высокую рызыку непагашэння такіх крэдытаў». А вось абвешчанае прыпыненне выдачы валюты, на думку банкіраў, як быццам бы павіннае знізіць небяспеку і для банкаў, і для насельніцтва.

Эканаміст Даследчага цэнтру ІПМ Зміцер Крук спрабуе разгледзець сітуацыю з пункту гледжання трох зацікаўленых бакоў:

Калі казаць пра банкі, то для іх гэта становіцца рашэнне, бо сапраўды пазбавіць іх ад рызыкі невяртання грошай ад крэдытораў. Для насельніцтва папярэджвае працэс назапашвання пазыкаў — тут пытанні хіба што маральна-этычнага аспекту.

Калі ж казаць пра эканоміку краіны наогул — гэта лагічнае дзеянне у рэчышчы дэдаларызацыі. Яно не пазбавіць эканоміку ўсіх праблем, але як адзін з крокаў — добрае рашэнне. Падкрэслю, яно спрацуе не як стратэгічны, а як кароткачасовы эфектыўны сродак.

### Хто сутыкнецца з праблемамі і нязручнасцямі?

1) Уладальнікі крэдытных картак.

З 28 ліпеня ўладальнікі крэдытных картак, выдадзеных беларускімі банкамі, не змогуць скарыстацца сваімі карткамі. З найбольшымі праблемамі сутыкнуцца беларусы, якія са сваімі крэдытнымі карткамі знаходзяцца за мяжой і не маюць пры сабе наяўных грошай. Яны не змогуць правесці ніводнай разліковай аперацыі.

**Эканаміст Зміцер Крук: Гэта не пазбавіць эканоміку ўсіх праблем, але як адзін з крокаў — добрае рашэнне.**

гуць разлічвацца сваімі карткамі, а таксама здымаць наяўную валюту ў банкаматах. Хутчэй за ўсё, кліентам банкаў давядзецца перазаключаць дамовы. Пакуль невядома, колькі будзе працягвацца пераафармленне і, адпаведна, праз які час беларусы зноў змогуць скарыстацца сваімі карткамі.

2) Грамадзяне, якія ўжо афармілі крэдыт у валюце, але не паспелі яго атрымаць цалкам.

Той, хто зняў толькі частку грошай, астатняй сумай цяпер скарыстацца не зможа.

3) Грамадзяне, якія збіраліся браць спажывецкія крэдыты для куплі тавараў за мяжой.

Тыя, хто не паспеў афарміць крэдыт у валюце, цяпер будзе змушаны атрымліваць рублі і толькі за іх купляць валюту. Зрэшты, вяртаць пазыку таксама давядзецца ў рублях. Прадстаўнікі аўтабізнэсу ўжо выказалі меркаванне пра тое, што рашэнне Нацбанку моцна ўдарыць па іх дзейнасці.

### Стабілізацыя чакаецца ў 2011 годзе

Цікавай выглядае фармулёўка тэрмінаў увядзення забароны. «Норма носіць часовы характар, будзе дзейнічаць да моманту стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы краіны», — тлумачаць у Нацбанку. Разам з тым, заканадаўча усталяваны час рашэння — да 1 студзеня 2011 году.

### Стаўкі па рублёвых крэдытах будуць расці

Як адрэагуюць банкі на новыя ўмовы працы? Па прагнозах Банку ВТБ, праз 1,5—2 месяцы стаўкі рублёвых крэдытаў павялічацца на 2-3%. Зрэшты, стаўкі па дэпазітах таксама павінныя вырасці.

**Ягор Марціновіч**

# На ўсе сто

**З 31 ліпеня ўступае ў сілу закон, які гарантуе 100-працэнтнае вяртанне ўкладаў насельніцтву пры адкліканні ліцэнзіі ў банку.**

Такім чынам дзяржава спрабуе ў чарговы раз нагадаць — нясіце грошы ў банкі, толькі там яны будуць у надзейных руках.

### Адказнасць дзяржавы расце

Варта нагадаць, што да 1 студзеня 2009 ў Беларусі існавала абмежаванне вяртанай сумы ў $1000 у эквіваленце. Пасля мяжу ўзнялі да 5000 еўра. Цяпер верхняй столі выплат не застанецца.

Механізм вяртання грошай застаўся ранейшы. Пэўную суму на «чорны дзень» павіннае захоўваць спецыяльна створанае Агенцтва па гарантаванай кампенсацыі банкаўскіх укладаў (дэпазітаў) фізічных асобаў. У гэтую рэзервовую скрыню скідваюць грошы ўсе банкі Беларусі. Напрыклад, Нацбанк павінен накіроўваць туды 80% свайго прыбытку. Праўда, прэцэдэнтаў выкарыстання сродкаў Агенцтва пакуль, дзякуй Богу, не было.

### Ці ўратуе Агенцтва?

Агенцтва з'явілася ў 2008 годзе, маючы на рахунку суму ў $125 мільёнаў. Цяпер у ім утрымліваецца сума, прыкладна роўная 5% ад агульнай колькасці дэпазітаў насельніцтва (каля $285 мільёнаў).

Гэтых сродкаў хопіць, каб адначасова разлічыцца з кліентамі некалькіх дробных банкаў. Але для пакрыцця рызыкаў хаця б адной буйной арганізацыі сродкаў па-ранейшаму недастаткова. Прычым не толькі «Беларусбанку», які паза канкурэнцыяй, бо мае больш за 60% укладаў, але і ўдзельнікаў рынку кшталту «Прыёрбанку» ці «Белінвестбанку».

### Жаданні ўладаў

— Асноўная мэта рэформы, праведзенай дзяржавай, — залучыць дадатковыя грошы ў айчынныя банкі. Разлічваюць на грошы перадусім буйнога бізнэсу і замежнікаў. Больш за тое, — адзначае эканаміст Сяргей Чалы, — Беларусь абяцае вяртаць грошы ў валюце дэпазіту. Даляравыя ўклады — аддаваць далярамі. Хоць у іншых краінах кампенсацыйныя агенцтвы выдаюць грошы ў нацыянальнай валюце. «Навошта даваць 100%-ю гарантыю? — не разумее Чалы. — Сусветная практыка — стварэнне мяжы адсячэння. Гэта значыць, што кампенсацыяй ахопліваецца каля 95% укладаў, а самыя вялікія не могуць спадзявацца на поўнае вяртанне сродкаў. Няма сэнсу даваць гарантыі на мільёны доляраў!»

Сапраўды, толькі некаторыя дзяржавы гарантуюць вяртанне грошай ў поўным аб'ёме і без абмежаванняў. Частка з іх мае добры нафтавы запас (Кувейт, Туркменістан), частка — краіны са стабільнай эканомікай (Ганконг, Ірландыя, Данія, Аўстрыя і Германія). Верхняя мяжа сумы кампенсацыі ў ЗША складае $250 тысяч, у Расіі — $23 тысячы, ва Украіне — $10 тысяч.

У міжнародных кантралявальных арганізацый могуць узнікнуць пытанні да Беларусі. Бо сітуацыя, калі падчас стварэння рахунку не трэба ўказваць крыніцу прыбытку і даецца 100%-я гарантыя вяртання грошай у валюце, — гэта нонсэнс. Гэта наўпростая дарога да адмывання грошай,— рэзюмуе Сяргей Чалы.

Аднак беларусам новаўвядзенне сапраўды даспадобы, бо дае пэўную гарантыю.

**Ягор Марціновіч**

**На 1 ліпеня 2009 года**

аб'ём дэпазітаў насельніцтва (і рублёвых, і ў іншай валюце) складаў 16,2 трыльёнаў рублёў ($5,7 мільярдаў).

## СЦІСЛА




У Мінску адчынілі «Дом Масквы».

### Горш, чым чакалі

Будзе праведзенае яшчэ адно карэктаванне бюджэту. Прыбыткаў катастрафічна не хапае, таму выдаткі будуць зменшаныя. «Мы маем мэтаю безумоўнае выкананне параметраў праграмы з Міжнародным валютным фондам, таму калі трэба будзе скарацiць выдаткі — скароцім», — заявіў міністр фінансаў Андрэй Харкавец.

### Буцікоў у Мінску паменела

Паводле інфармацыі ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкаму, у сталіцы закрываецца большая частка буцікоў. Гэта адбываецца нягледзячы на скідкі, якія дасягаюць 50—70%. Нават пры сённяшніх цэнах буцікі не вытрымліваюць канкурэнцыі з іншымі аб'ектамі гандлю, якія рэалізуюць вялікую колькасць тавараў аднachасова.

### Беларускія тралейбусы будуць збіраць у Растоўскай вобласці

МАЗ шукае пляцоўку для зборачнага цэху тралейбусаў. Гэта дазволіць задаволіць замовы ў паўднёвых рэгіёнах Расіі. Вытворчасць атрымае падатковыя прэферэнцыі.

### 40 краін п'юць беларускае малако

Міністэрства сельскай гаспадаркі наладзіла гандлёвыя сувязі з Блізкім Усходам, а цяпер будзе спрабаваць дамовіцца з краінамі Еўрасаюзу.

### «Белсвісбанк» хоча набыць Мінскі парцалянавы завод

Банк гатовы набыць прадпрыемства, часткова захаваць яго профіль, а таксама ўзяць на сябе расходы па вынасе заводу за тэрыторыю сталіцы.

### Віскі не па-глабалісцку

«Мінск-крышталь» пачынае выпуск шатландскага віскі. У продажы з'явяцца бутэлькі па 0,2 і 0,7 літра. У гэтым годзе плануецца выпусціць 5 тысяч дэкалітраў.

**ЯМ**

# Байдэн: Нават такі расійскі пратэктарат як Беларусь устаў на дыбкі

Віцэ-прэзідэнт ЗША даў інтэрв'ю газеце «Уол-стрыт джорнал» па выніках свайго падарожжа ў Грузію і Украіну. У ім ён падсумаваў палітыку новай амерыканскай адміністрацыі ў дачыненні да Расіі і Усходняй Еўропы.

Ён адзначыў, што эканоміка Расіі «ссыхаецца», і выказаў думку, што гэтая тэндэнцыя вымусіць гэтую краіну пайсці насустрач Захаду па цэлым шэрагу пытанняў нацыянальнай бяспекі, у тым ліку ў справе ўплыву на краіны былога СССР і скарачэння атамнага арсеналу.

На думку Байдэна, бязладдзе ўнутры Расіі будзе галоўным чыннікам, які будзе вызначаць замежную палітыку Расіі ў будучыні. «Думаю, мы моцна недаацэньваем руку, якую трымаем», — сказаў ён.

«Расіі давядзецца пайсці на вельмі цяжкія, праліčаныя рашэнні», — сказаў Байдэн. «У іх скарачаецца насельніцтва, у іх эканоміка ссыхаецца, у іх банкаўскі сектар і [інфра]структура такія, што 15 гадоў не вытрымаюць, яны ў такой сітуацыі, што свет мяняецца хутчэй за іх, а яны чапляюцца за тое ў мінулым, чаго яны ўтрымаць нездольныя».

Гэта былі самыя рэзкія заявы высокага чыноўніка з Вашынгтону ад часу візіту Абамы ў Маскву. Як вядома, адміністрацыя Абамы заявіла пра сваё жаданне перазагрузіць адносіны з Масквой. Тое самае ў пачатку свайго прэзідэнцтва спрабавалі ажыццявіць Клінтан і Буш, аднак гэта мала што дало.

Байдэн у сваім інтэрв'ю не міндальнічае. На ягоную думку, Масквой сёння кіруюць не «абсалютныя ідэолагі з сярэднім інтэлектам, якія чапляюцца за тое, у што ніхто не верыць. Гэта канкрэтныя прагматыкі, урэшце».

Таму рэаліі сённяшняга свету прымусяць Маскву падтрымліваць Захад у найважнейшых пытаннях: «Я магу сабе ўявіць, як сядзіць Пуцін у Маскве і кажа: «Божа мой, у Ірану будзе бомба, і да каго яна першага [даляціць]?» Да Масквы, не да Вашынгтону».

Байдэн не выключае, што нягледзячы на эканамічныя і геапалітычныя праблемы Расія ў кароткатэрміновай перспектыве можа быць ваяўнічай.

На ягоную думку, лідэры Расіі паступова ўсведамляюць змяншэнне ролі Расіі ў свеце, але



ЗША трэба праяўляць асцярожнасць, не выпячваючы сваю перавагу. Ён узгадаў словы свайго бацькі: «Не заганяй другога ў куток, з якога адзіны выхад — паўз цябе».

Словы Байдэна сведчаць, што адміністрацыя Абамы мяркуе, што баланс сілаў у адносінах з Расіяй цалкам схіліўся на бок ЗША, і таму Вашынгтон зможа пераканаць Маскву скараціць атамныя арсеналы, зменшыць ціск на маладыя дэмакратычныя дзяржавы, што паўсталі на межах Расіі, і супрацоўнічаць у пытаннях спынення атамных праграмаў Ірану і Паўночнай Карэі.

«З гэтым цяжка звыкнуцца — што імперыю страцілі, — прызнаў Байдэн. — Што, на іх раптам найшло прасвятленне, і яны заракліся: «Гэй, ты, мы больш не будзем суседзям пагражаць»? Не. Яны не могуць гэтага вытрываць».

Спробы Масквы зацугляць постсавецкія краіны, выкарыстоўваючы ў якасці пагрозы пастаўкі энергарэсурсаў, праваліліся, заявіў Байдэн. Спрэчкі з Украінай толькі прыспешылі стварэнне праекту «Набука».

У выніку ўнутранага бязладдзя ў Расіі зменшылася здольнасць Масквы ўплываць на падзеі ў краінах былога СССР, якія, у рознай ступені, дабіваюцца большай незалежнасці ад Масквы.

Расія трымае тысячы вайскоўцаў у Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, двойчы за тры гады адключала газ Украіне. «Нягледзячы на гэтую дэманстрацыю сілы нават такі поўны пратэктарат Расіі як Беларусь паказваў прыкметы таго, што ўстае на дыбкі ад [палітыкі] Масквы».

(«Even a close Russian protectorate such as Belarus has shown signs of bucking Moscow recently»).

Гэта была адзіная згадка пра Беларусь у інтэрв'ю.

**Мікола Бугай; цытаты з wsj.com**

**Пратэктарат**

форма міждзяржаўных адносінаў, пры якіх адна краіна прызнае над сабой вяршэнства іншай, перш за ўсё ў міжнародных адносінах. Пры гэтым захоўваецца аўтаномія ва ўнутраных пытаннях і ўласная сістэма кіраўніцтва. Мацнейшая краіна бярэ такую слабейшую пад вайсковую і дыпламатычную апеку, інакш кажучы, пратэкцыю. Узамен за гэта пратэктарат звычайна бярэ на сябе асаблівыя абавязкі. Згодна з міжнародным правам, пратэктарат прызнаецца асобнай дзяржавай.

Фактычным пратэктаратам ЗША цяпер застаецца востраў Пуэрта-Рыка. Дэ-факта пратэктаратамі Расіі сталі Абхазія і Паўднёвая Асеція. Прыкладамі пратэктарату былі Грузія ў 1786—1801 гадах пад пратэктаратам Расіі, Славаччына ў 1939—1944 пад пратэктаратам Германіі, Індыя Вялікіх Маголаў у 1803—1858 гадах пад пратэктаратам Брытаніі.

Калі раней пратэктараты існавалі адкрыта, то апошнім часам у міжнародных адносінах пераважаюць сукрытыя спосабы дамінацыі.

Сяброўскія і каланіяльныя формы пратэктарату часта пераплятаюцца. На словах пратэктар нярэдка дэкларуе свае выключна маральныя матывы для пратэктарату. Імі могуць быць гуманітарныя меркаванні, пытанні этнакультурных, рэлігійных сувязяў, супольнай ідэалогіі, абароны ад супольных ворагаў, неабходнасці эканамічнай падтрымкі і развіцця менш развітае тэрыторыі. Раней у разгляд часта ўваходзілі таксама дынастычныя матывы. На справе ж найчасцей гаворка ідзе пра кантроль над стратэгічна важнай тэрыторыяй, рэсурсамі ці асіміляцыю кантраляванага насельніцтва.

Далучэнне Абхазіі і Асеціі да саюзу Беларусі і Расіі ўзмацніла б пратэктаратны змест гэтай міждзяржаўнай канструкцыі.

**Прыкметы пратэктарату ў Беларусі**

Пасля 1996 Беларусь практычна не вяла самастойнай міжнароднай палітыкі, усе яе крокі капявалі расійскія. Так доўжылася аж да 2008 году, калі Беларусь не прызнала незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, абвешчанай пад аховай расійскіх войскаў. Структура органаў дзяржаўнага кіравання і сілавых структураў у Беларусі вельмі набліжаная да расійскай. Беларусь ад 1995 году ўзяла курс на замену беларускай мовы расейскай. Усе версіі беларускай гісторыі і культуры, альтэрнатыўныя расійскацэнтрычнай, выціскаюцца. Беларусь знаходзіцца пад парасонам (і кантролем) расійскай сістэмы ПВА і расійскіх спецслужбаў.

**Віцэ-прэзідэнт ЗША**

адказвае за кірункі, вызначаныя прэзідэнтам. Найчасцей займаецца пытаннямі міжнародных адносінаў і бяспекі. У выпадку недзеяздольнасці ці адхілення прэзідэнта займае ягоную пасаду.

**Джо Байдэн**

стаў віцэ-прэзідэнтам у звязцы з Баракам Абамам. Належыць да памяркоўнага крыла Дэмакратычнай партыі. Каталік. У бытнасць сенатарам займаўся міжнароднымі пытаннямі. Вядомы сваім языком, з якога часам злятае тое, што іншыя трымаюць наўме.

# Палітыка арэляў

Лукашэнка разлічвае на доўгатэрміновае манеўраванне між Усходам і Захадам. Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

На традыцыйнай летняй нарадзе з кіраўнікамі дыпмісій беларускі афіцыйны кіраўнік дазволіў сабе ўскосную палеміку з заходнімі ментарамі. Маўляў, «важная ды патрэбная не вонкавая «дэмакратычная» абалонка. І тым болей не прывезеная і не накінутая звонку. Такая спехам прывітая дэмакратыя няўстойлівая». Яшчэ болей, «такія «мічурынскія» практыкаванні робяць цяжкапапраўную шкоду краіне, эканоміцы і, урэшце, народу».

Адчуваецца стыль спічрайтэраў старой загартоўкі. Моладзь, бадай, і не чула пра таго Мічурына. Кранае нястомны клопат, каб народ не заразіўся дэмакратычнай бацылай, як тым свіным грыпам.

Асобна падкрэслена, каб і ў ЕС не спадзяваліся, што будуць накідаць нейкія патрабаванні. Мы, маўляў, уваходзім ва «Усходняе партнёрства» не просьбітамі і будзем самі вызначаць фармат.

Можна адзначыць яшчэ некалькі заяваў на нарадзе 23 ліпеня. Беларусь не збіраецца рабіць выбар паміж Расіяй і Еўрасаюзам, зазначыў Лукашэнка. Маўляў, ўзаемадзеянне з Брусэлем не можа будавацца на шкоду дружалюбным дачыненням з Масквой і наадварот.

Як жа, з Масквой — дружалюбней няма куды: з войнаў на ўсходнім фронце не вылазім! Лукашэнка і сам ужыў цікавы тэрмін пра пагрозу «цяжкагавай дзяржаўнасці» з боку Расіі.

Па сутнасці ж гэтая нібыта прыгожая і высакародная адмова ад выбару — эўфемізм, які маскуе стаўку на палітыку арэляў, разлік на доўгатэрміновы рэсурс манеўравання між Усходам і Захадам.

Зрэшты, не забытыя і іншыя вектары. У прыватнасці, зазначана, што ў перспектыве Украіна можа стаць новым шляхам пастаўкі энергарэсурсаў. Мінск даўно зандуе глебу ў гэтым кірунку, але на нарадзе з саноўнымі дыпламатамі фраза гучыць ужо як афіцыйная стратэгічная ўстаноўка.

**Дэкларацыя раўназначнасці дачыненняў з Усходам і Захадам — гэта амаль што рэвалюцыйная змена арыенціраў.**

Саюзны праект Лукашэнка назваў даўгабудам, але не правалам і не ўтопіяй. Формула, каб захаваць твар. Насамрэч — менавіта правал, менавіта ўтопія. І хаця ў самым пачатку прамовы было падкрэслена, што мудры замежнапалітычны курс непахісны, гаворка нібыта толькі пра карэктаванне нюансаў, дэ-факта адбылася хай сабе змушаная, але істотная пераробка ўсёй канцэпцыі. Раней выглядала так, што альтэрнатывы, процівагі Расіі няма. Цяперашняя дэкларацыя раўназначнасці дачыненняў з Усходам і Захадам — гэта амаль што рэвалюцыйная змена арыентыраў.

Між тым расійскі ціск нікуды не падзеўся, ён узмацняецца. Намеснік міністра замежных справаў Расіі Карасін назваў дзіўнай пазіцыю Мінску ў дачыненні да Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. І вельмі падобна да таго, што менавіта званок з Крамля ў духу «не чапайце нашую трубу» змусіў хуценька зноў даць зялёнае святло прапампоўцы расійскай саляркі па беларускім участку маршруту Унеча — Вентспілс.

«Раней Захад быў ворагам, а расійцы — братамі, адзінымі стратэгічнымі партнёрамі. Цяпер фактычна канстатуецца парытэт у стасунках з Масквой і Захадам. І гэта — значны зрух, нават паварот у замежнай палітыцы», — мяркуе палітолаг Валер Карбалевіч.

З яго словаў, на нарадзе 23 ліпеня адбылося зацверджанне таго замежнапалітычнага курсу, які Мінск пачаў праводзіць пасля леташняй каўказскай вайны. «У астатнім жа — нічога новага», — рэзюмуе Карбалевіч.

Сапраўды, прамова на нарадзе лішні раз засведчыла: цывілізаваныя дэмакратычныя стандарты будуць і надалей уяўляцца цяперашняй кіроўнай вярхоўцы смяротна небяспечнай пандэміяй.



SVABODA.ORG

# Славамір Адамовіч: Так, як я жыў, чалавек жыць не павінен

47-гадовы Славамір Адамовіч — паэт ад Бога — у пачатку 2000-х выехаў у Нарвегію. І вось новы паварот у лёсе. Ці канчатковае вяртанне?

— Так, гэта ўжо канчаткова...

**— Чым выкліканае рашэнне? Усё ж тэрмін за мяжой пражыты немалы...**

— Тэрмін немалы, але так, як я жыў, чалавек жыць не павінен. Перспектывы там ніякай не было, дый сем гадоў — дастаткова тэрмін, каб убачыць відавочнае і зрабіць такі крок, які я ўрэшце і зрабіў.

**Svaboda.org**

# Расійскія нацысты пагражаюць смерцю беларускай блогерцы

**Гіганцкі скандал у інтэрнэце, на блогах LiveJournal.com, разгарэўся вакол публікацыі Тацяны Елавой, што піша пад нікам zmagarka.**



Яна выставіла допіс, што надоўга завіс у топе Яндэкс-рэйтынгу і набраў 2000 каментароў. Рэакцыя на яго з боку расійскае аўдыторыі перайшла ўсе межы.

### Шок для маладога пакалення расейцаў

Zmagarka змясціла відэа, знятае чачэнскімі партызанамі ў 1999 г., у пачатку другой чачэнскай вайны. Бязлітасны аператар фіксуе, як пеаразаюць горла расійскім палонным. Відэа мела мэтаю запалохаць федэральныя войскі. Гэты ролік фігураваў у інтэрнэце і раней. Яго выкарыстоўваў у сваім фільме беларускі рэжысёр Юры Хашчавацкі. Аднак для маладога пакалення расійцаў, якія выраслі на стэрыльна-пераможных рэляцыях ТВ пуцінскага часу, відэа сталася шокам. Да таго ж, zmagarka дала адмыслова правакацыйны загаловак: «Расійскіх салдатаў чачэнцы рэжуць, як свіней». Расійская аўдыторыя ўспрыняла яго як абразу.

Хоць zmagarka супраўдзіла запіс стрыманым каментаром: «Крый Божа, натуральна, не ўхваляю гэткага культу гвал-тоўных дзеянняў датычна якога-кольвек чалавека, нават найлюцейшага ворага, якім ёсць імперская Расея для чачэнцаў, але дакуль акупацыйныя войскі стаяць у Чачэніі, яны будуць працягвацца», — гэта не дапамагло.

Рэакцыя расійскай ЖЧ-супольнасці была лютай. Расійскія юзеры запатрабавалі ад мадэратараў LiveJournal.com сцерці допіс. Тыя адмовіліся — ён не парушаў правілаў платформы, адно перавялі ў раздзел «Для карыстальнікаў, старэйшых за 18».

### Закатаць у бетон

Адзін з блогераў накіраваў заяву на імя генпракурора Беларусі з заклікам прыцягнуць Тацяну Елавую да адказнасці за распальванне варожасці да расійцаў. «Полковник Буданов придёт за тобой, сука!» — напісаў ён у каментарах Змагарцы непасрэдна. [Буданаў — палкоўнік расійскай арміі, які згвалціў і забіў 18-гадовую чачэнку, — факт стаў вядомы, прычым аднавяскоўцам удалося сабраць доказы. Палкоўніка пасля маруднага трохгадовага працэсу засудзілі. Адваката сям'і замучанай чачэнкі застрэлілі ў Маскве ў 2009 годзе].

«Прыйдзе і твая чарга», — абяцае Змагарцы іншы. «З'явіцца відэа, дзе гэтай [...] будуць павoлі адразаць галаву тупым нажом», — заяўляе трэці. І гэта самае карэктнае з таго, што абяцаюць расійскія ЖЖысты Змагарцы.

Расійскія блогеры ў «адказ» размясцілі на блогу Змагаркі фоты забітага Масхадава, кадры масавага пахавання расстраляных партызанаў з нагамі, скручанымі дротам, — «вось што мы з імі зрабілі», а таксама забітых грузінскіх вайскоўцаў у Асеціі.

Адбыўся сапраўдны выбух нянавісці: маладыя і старыя, хлопцы і дзяўчаты паставіліся да Змагаркі аднолькава. Большасць допісаў цытаваць немагчыма. Яны поўняцца казармавым матам і садызмам, роўным таму, што выяўлена на відэа. Яны адрасаваныя не толькі Змагарцы, утрымліваюць заклікі закатаць у бетон усе ўсходнееўрапейскія народы.

«Капай сабе магілу, сука падкалодная! Мы цябе павесім!» — піша нейкі скінхэд. «Раней я сустракаў бульбашоў, усе смірныя былі, а гэтая нейкі вырадак», — уступае аднадумец. Старэйшыя абяцаюць Змагарцы лёс расійскіх журналістак, забітых ці згвалчаных за тое, што пісалі пра Чачэнію.

«Найхутчэй, яе возьмуць у дзярждэп ЗША на пасаду галоўнага кансультанта па расійскім пытанні!» — жартуе іншы.

Расійцы таксама размясцілі спасылку на каардынаты Елавой на сайце-супольнасці Vkontakte.ru.

### «Справа подлая і немужчынская»

Толькі асобныя расійскія каментатары асуджаюць найперш вайну ў Чачні як такую. У ёй загінула каля 12 тыс. расійскіх вайскоўцаў і да 100 тыс. чачэнцаў. Першая фаза канфлікту скончылася паразай расійскага экспедыцыйнага кантынгенту ў 1996-м. Масква сабралася з сіламі, і ў другой фазе, пры Пуціну, Чачэнія была сцертая дашчэнту, а ў Грозным сеў прарасійскі рэжым Кадырава.

Каментароў з Беларусі, Украіны ці самой Чачні вобмаль — тэма зачапіла ўнутрырасійскія раны.

«Садысцкае забойства, бяззбройнага ваеннапалоннага, ды перад камерай — справа ў любым выпадку подлая і немужчынская. Гэткі нацысцка-нквдшны стыль характэрызуе чачэнскіх баевікоў як не вялікаў вызваленчай арміі, а труслівых бандытаў-экстрэмістаў», — піша блогер czalex.

Іншы папулярны беларускі блогер b0rmann дапускае расісцкія выпады на адрас чачэнцаў і працягвае: «Пацыфікацыя Чачэніі — адзін з кірункаў знешняе палітыкі Расеі, які не пабаюся публічна падтрымаць».

«Нічога не маю супраць чачэнскай незалежнасці. Катэгарычна нязгодны з расейскай замежнай палітыкай (дарэчы, відэаролік — гэта яе адлюстраванне, адбітак у чачэнскім кантэксце), але кадры забойстваў — па-за межамі ўсяго чалавечага», — гідзіцца alehmackievic.

Ёсць і беларускія блогеры, што наўпрост салідарызуюцца з расійцамі: «Терпеть не могу [бело-] красно-белых мразей у нас в республике», — падтрымлівае сваіх расійскіх фрэндаў блогер dzichenka.

### Нічога не раіць — раўнасільна падтрымцы забойстваў

Сама Тацяна Елавая пра свой допіс не шкадуе. «Я хацела стварыць рэзананс вакол Чачні як такой, — сказала яна «Нашай Ніве». — Можна хадзіць у ружовых акулярах і рабіць выгляд, што праблемы не існуе. Па вялікім рахунку, усё жыццё ў сучаснай Расіі — гэта гвалт улады над народам. Шкада расійскіх хлопцаў, якіх забіваюць у Чачні. Але віной таму кіраўніцтва Расіі. Не разумець гэтага факту і нічога не рабіць з гэтым раўнасільна падтрымцы працягу падобнага роду забойстваў. Як сказала ў інтэрв'ю «Эху Москвы» Валерыя Навадворская, Расіі патрэбныя не браты і сёстры, не сябры і калегі, але толькі рабы. Каўказ жа — гэта не тое месца, дзе яны водзяцца. У выніку — узброены канфлікт, які цягнецца не першы год».

Што Елавая думае аб прапановах многіх блогераў забараніць публікацыю актаў гвалту ў LJ? «Я супраць цэнзуры. Сёння забараняем відэа, на якіх рэжуць расійскіх салдат, заўтра забараняем відэа, на якім амапавец збівае бабулю на «Маршы нязгодных». Бо навошта — гэта можа парушыць яго прыгожы ўтульны свет, дзе ўсе думкі — аб рэчцы і шашлыках».

Ці яна баіцца пагрозаў? «Баяцца — не ў маім характары і не ў маёй біяграфіі. Дарэчы, прыйшло нямала прыватных паведамленняў ад знаёмых і незнаёмых людзей, якія прапануюць дапамогу ў выпадку небяспекі. Што больш за ўсё радуе: большая палова з іх — менавіта расійцы. Што прымушае верыць у тое, што шлях Расіі да дэмакратыі не з'яўляецца казкаю».

А што пра ўсё гэта думае мама Тацяны? «Мама не чытае ЖЧ, але маю пазіцыю наконт Расіі цалкам падзяляе. Каму, як не беларусам, ведаць аб гэтым».

**Мікола Бугай**

# Перажыць Чарнобыль

Праект «Практычныя падыходы па фармаванні здаровага ладу жыцця на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях» працуе ў Беларусі ўжо некалькі гадоў. Фінансуе яго Еўрапейскі Саюз. У Беларусі 21 раён, пацярпелы ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, але пачаць вырашылі з Чачэрскага, Брагінскага, Слаўгарадскага і Столінскага як з эксперыментальных.

Гэтая праграма адрасаваная найперш дзецям, вымушаным жыць на забруджаных тэрыторыях. Таму і складовыя часткі «Практычных падыходаў» былі распрацаваныя з улікам развіцця дзіцячай псіхалогіі.

### Сумныя лекцыі скасоўваюцца — роўны навучае роўнага

Якому падлетку хочацца выслухоўваць нудную лекцыю? З такой лекцыі школьнік у найлепшым выпадку не вынесе нічога. А ў найгоршым — захоча зрабіць усё наадварот…

Трэнеры навучалі педагогаў з Чачэрскага, Брагінскага, Слаўгарадскага і Столінскага раёнаў. Тыя, у сваю чаргу, перадалі падлеткаў 240 школьнікам-трэнерам. І вось самі вучні ўзяліся за працу. Цяпер ужо падлеткі-трэнеры прыходзяць у школы і… гуляюцца са сваімі аднагодкамі. Сумныя лекцыі скасоўваюцца! Прынцып «роўны навучае роўнага» не дарма лічыцца ў сучаснай педагогіцы найбольш дзейсным і эфектыўным.

Дарэчы, ад школьнікаў, што хочуць стаць трэнерамі, не было адбою. Давялося праводзіць жорсткі кастынг.

### Форум-тэатры

Яшчэ адна цудоўная творчая методыка па навучанні называецца «Форум-тэатры». З дапамогай тэатральнага мастацтва разглядаюцца праблемныя сітуацыі. Сцэнар «п'есы» школьнікі прыдумляюць самі, самі і разыгрываюць яе перад аднагодкамі. А потым гледачы і акторы мяняюцца месцамі і перайграюць сцэнар па-свойму, іначай расстаўляючы акцэнты, знаходзячы іншыя выхады з сітуацыі.

Напрыклад, дзеці прыдумалі і разыгралі п'есу пра ВІЧ-інфікаваную дзяўчынку Таню. Дзяўчынка ўваходзіць у клас і сядае за парту. У гэты ж момант дзеці, што сядзяць вакол, перасаджваюцца. Уваходзіць настаўнік і пачынае правяраць хатняе заданне. Таня адзіная з усяго класу падымае руку, але выкладчык яе ігнаруе… Потым Таня ідзе адна дахаты, а аднакласнікі ідуць ззаду, перасмейваючыся… Дома на заплаканую Таню накідваецца мачыха: «Чаму не ідзеш рабіць урокі? Калі ж ты здохнеш, як і твая ВІЧ-інфікаваная маці?» Таня знаходзіць упакоўку з пігулкамі і выбягае з хаты…

У працэсе п'еса перарываецца, і вядоўца прапануе ўдзельнікам абмеркаваць праблемы: магчымыя стасункі ВІЧ-інфікаванага дзіцяці з аднакласнікамі, настаўнікамі, хатнімі. І спектакль перайграецца па новым сцэнары.

### Званкі на гарачую лінію ідуць кожны дзень

У рамках праекту былі створаныя інфармацыйна-асветніцкія кабінеты. Гэта толькі назва сумная, а насамрэч у гэтых кабінетах усталявалі кампутары, інтэрнэт, музычныя цэнтры, мультымедыйныя праектары з прэзентацыямі праграмы. Для гэтых аддаленых эксперыментальных раёнаў – цэлая рэвалюцыя! Дзеці могуць прыходзіць і вывучаць матэрыялы па тэме здаровага ладу жыцця, шукаць дадатковую інфармацыю ў сеціве. І ўсё гэта бясплатна!

У кожным з такіх кабінетаў у Чачэрскім, Брагінскім, Слаўгарадскім і Столінскім раёнах з'явіліся гарачыя лініі, па якіх можна званіць і дарослым, і дзецям. Дарослыя часцей пытаюцца, як ім правільна харчавацца, як правяраць на наяўнасць радыяцыі прадукты з гароду альбо грыбы-ягады з лесу і ці трэба наагул іх правяраць. Дзеці звоняць у асноўным старэйшага ўзросту. Цікавяцца праблемамі СНІДу, пытаюцца, напрыклад, ці не шкодна ім загараць на нашым сонцы і ці можна ехаць на поўдзень. Дарэчы, праект скончыўся, а лінія працягвае працаваць.

— Як жа ж мы можам яе закрыць, калі званкі ідуць кожны дзень! — кажа спецыяліст праекту, якая працуе на гарачай лініі ў Слаўгарадзе, — Святлана Калпачова.

# Справа тэхнікі

**Вярхоўны суд не адмяніў прысуд Брэсцкага абласнога суда ў дачыненні да супрацоўнікаў «Медтэхнікі» на чале з дырэктарам Станіславам Нарывончыкам. Пінская кампанія пастаўляла ў Беларусь спісаную медтэхніку. У тым ліку дэфебрылятары — прыборы для аднаўлення працы сэрца. Махляры падраблялі год выпуску.**

У сакавіку гэтага году іх абвінавацілі ў здзяйсненні махлярства арганізаванай групай у асоба буйных памерах. Паводле абвінавачання, яны фальсіфікавалі дакументы і рэалізоўвалі бальніцам медтэхніку невядомага паходжання і непрыдатную для выкарыстання. Выпадак рэдкі ў крымінальнай практыцы і, бадай, адзіны ў крымінальнай практыцы Беларусі. Следства скончылася, але пытанні пакуль засталіся.

Крымінальная справа была ўзбуджаная ў чэрвені 2007 года. Органы следства заявілі, што фірма, якой кіраваў Нарывончык, сфальсіфікавала і рэалізавала на тэрыторыі Беларусі 315 адзінак медыцынскай тэхнікі, «загадзя непрыдатнай да эксплуатацыі». У спісе значыліся дэфібрылятары — прыборы для ўзнаўлення сардэчнага рытму, дэзінфікуючае абсталяванне, апараты для перарывання цяжарнасці, для карэкцыі дзіцячай касавокасці і інш. Паводле следства, агулам абвінавачаныя завалодалі грашовымі сродкамі на суму больш за 300 мільёнаў рублёў.

Дзяржабвінавачанне выявіла схему, па якой працавала «злачынная група»: яны скуплялі за мяжой спісаную медтэхніку і пасля яе «амалоджвалі». Ставілі больш ранні год выпуску, а дакументы падраблялі. Такім чынам, абсталяванне прызнавалася прыдатным да эксплуатацыі і прадавалася беларускім медыцынскім установам.

Следства ўсе 315 адзінак тэхнікі апячатала. Зараз паводле рашэння суда іх павінны знішчыць. Аднак некаторыя бальніцы просяць пакінуць абсталяванне, бо нічога лепшага наўзамен не маюць.

### Банда ці адзіночкі?

Спрэчным момантам у гэтай справе з’яўляецца той факт, што Нарывончыку і ягоным супрацоўнікам інкрымінавалі здзяйсненне злачынства «ў складзе арганізаванай групы». Такое абвінавачанне абцяжвае віну. Бок абароны спрабаваў давесці, што дзеянні абвінавачаных не былі звязаныя адзіным намерам і ніхто не абгаворваў умовы ажыццяўлення злачыннай дзейнасці, таксама не размяркоўваўся і прыбытак ад рэалізацыі вырабаў са зменай тэхнічнай дакументацыяй.

### Лыжка дзёгцю ў бочцы мёду

Пінская «Медтэхніка» была найбуйнейшым пастаўшчыком танных апаратаў, пра што сведчылі ў судзе водгукі дзесяткаў лячэбных устаноў. Дарэчы, інкрымінаваная тэхніка са змененымі пашпартамі за той перыяд склала менш за 1% таваразвароту.

Створаныя Нарывончыкам фірмамі праз розныя падаткі ў бюджэт адлічаліся тысячы даляраў у дзень. Сёння праз канфіскацыю маёмасці фірма фактычна падлягае знішчэнню. Некалькі сотняў людзей згубяць працу. Не дапамагло Нарывончыку, што ён не раз прызнаваўся ўладамі



БЕЛГАЗЕТА

Станіслаў Нарывончык.

найлепшым прадпрымальнікам Брэстчыны і краіны ў сферы медабсталявання.

У судзе абвінавачаны Нарывончык прызнаў сваю віну. Але толькі ў тым, што недагледзеў за падначаленымі, якія падраблялі дакументы. Абарона сцвярджае, што нельга сказаць, нібыта сама тэхніка была сфальсіфікаваная. Паводле паказанняў працаўнікоў, якія падраблялі дакументы (у чым прызнаваліся ў судзе), ніякіх зменаў у тэхніку ніколі не ўносілася. Рэалізаваная тэхніка, эксплуатацыя якой працягвалася да 6 гадоў, паспяхова функцыянавала і ніколі не выклікала нараканняў з боку дактароў і пацыентаў.

### «Органы не памыляюцца»

Адвакаты асуджаных да апошняга спадзяваліся, што Вярхоўны суд зменіць рашэнне Брэсцкага суда.

Адвакат Станіслава Нарывончыка В.Сазанчук мяркуе, што ў справе пінскай «Медтэхнікі» спрацаваў прынцып «Органы не памыляюцца»: «Наколькі я разумею, у свой час кіраўніку дзяржавы было дакладзена, што, маўляў, гандлявалі былым ва ўжыванні, непрыдатным хламам . І кіраўнік дзяржавы не мог не сказаць: «Разабрацца і пакараць». І я б на яго месцы так сказаў. Але калі разабрацца, што гэта не зусім так, што ўсё злачынства толькі ў тым, што змянілі пашпарт, інструкцыю па эксплуатацыі, — згладжвае справу адвакат. — Усе тэхнічныя параметры засталіся тымі ж, толькі год у ёй змянілі. Дык трэба суадносна караць за гэта, калі ў гэтым ёсць склад злачынства, а не за нейкі крадзеж, якога і блізка тут няма. Гэтая справа ў свой час была ўзбуджаная намеснікам генеральнага пракурора зусім па іншым артыкуле, па артыкуле 250 «Прадстаўленне недакладнай інфармацыі пра тавары», які б дазволіў выйсці з

**На звароце Нарывончыка да кіраўніка дзяржавы былы міністр унутраных спраў Навумаў напісаў: «Нахабнік».**

сітуацыі, што і органы не памыляюцца, і ў той жа час людзі не пакараныя за тое, чаго не здзяйснялі».

Сазанчук мяркуе, што сваю ролю магла адыграць і рэзалюцыя, дадзеная былым міністрам унутраных спраў Уладзімірам Навумавым. На дакументах, звязаных са зваротам Нарывончыка да кіраўніка дзяржавы з просьбай спыніць у дачыненні да яго крымінальны пераслед, Навумаў напісаў «Нахабнік».

Пасля таго звароту да прэзідэнта былі дадаткова затрыманыя яшчэ двое супрацоўнікаў фірмы.

У той жа час Аляксей Багамазаў, былы супрацоўнік «Медтэхнікі» выступаў у Вярхоўным судзе з просьбай пакінуць прысуд без зменаў.

### «Навошта хлопца саджаць у турму?»

Акрамя Станіслава Нарывончыка, розныя тэрміны абмежавання свабоды атрымалі яшчэ пяцёра супрацоўнікаў фірмы: ад абмежавання свабоды без накіравання ў выпраўленчую ўстанову (такі прысуд вынеслі Багамазаву, які спрыяў следству) і 3, 6 і 8 гадоў пазбаўлення свабоды іншым.

На паседжанне Вярхоўнага суда прыйшла маці аднаго з асуджаных Юрыя Каліноўскага, які атрымаў 3 гады ўзмоцненага рэжыму: «Ён менш за ўсіх працаваў на гэтай працы... І насамрэч ніякай банды там не было, ніякай змовы... Юра вучыўся ва універсітэце... Тое, што ён подпісы ставіў, многія яго подпісы — нават следчы сам казаў — былі падробленыя. Калі ён вінаваты, то хоць бы які-небудзь штраф далі, хоць умоўна яго пакаралі. Навошта хлопца саджаць у турму?»

Гэты каментар маці Ю.Каліноўскага давала карэспандэнту «НН» у пятніцу. У нядзелю жанчыны не стала — не вытрымала сэрца.

Адвакаты асуджаных не здаюцца і збіраюцца накіроўваць скаргі ў парадку нагляду ў Вярхоўны суд.

Цяпер галоўнае следчае ўпраўленне МУС даследуе яшчэ адну справу ў дачыненні да саўдзельнікаў, дзякуючы якім пінская «Медтэхніка» нібыта мела надзейнае прыкрыццё «зверху». У зону ўвагі трапляюць некаторыя чыноўнікі і прадстаўнікі органаў. Ці скончыцца гэта судовым працэсам — невядома. А варта было б.

**Вольга Жарнасек**

## СЦІСЛА

### Дарогі бяруць даніну людзьмі

За мінулыя выхадныя ў Беларусі ў ДТЗ зноў загінула восем чалавек. У тым ліку адно дзіця. У Ваўкавыску 31-гадовы хлапец на «Маздзе» наехаў на трохгадовага хлопчыка. Той памёр. А ў Лідскім раёне каля другой ночы 26-гадовы кіроўца «Нісану» раздушыў двух раварыстаў, мужчыну і жанчыну. Між Салігорскам і Слуцкам іншы кіроўца не заўважыў матацыклу «Ямаха» і пры абгоне з ім сутыкнуўся. Загінулі абодва. Пацярпела і дзіця, што ехала без спецыяльнага сядзення.

Дарэчы, выкарыстанне дзіцячага крэсла ў выпадку ДТЗ зніжае смяротнасць малых дзетак пры аварыяў на 71%.

### Карова забіла пастуха

На пашы ля вёскі Старынкі Алёхнавіцкага сельсавета (Маладзечанскі раён) карова да смерці рагамі і нагамі стаптала 57-гадовага пастуха. Другі пастух адганяў яе, але сам атрымаў удар у сцягно. На падмогу кінуліся трактарысты, ды зноў безвынікова. Тады выклікалі работніка птушкафабрыкі з ружжом і застрэлілі рагулю. Экзекуцыя каровы над чалавекам доўжылася каля дзесяці хвілін.

Ці то карова ашалела, ці тое была пасляродавая агрэсія. Нядаўна карова ацялілася. Пастух, заўважым, быў цвярозы.

### Даў драла, прабіўшы плот на могілках

34-гадовы барысавец ехаў п’яны за рулём «БМВ» і збіў 66-гадовую жанчыну. Гэта здарылася на дарозе Неманіца—Пагадзіца—Кастрыца. Пасля гэтага кіроўца знік з месца здарэння, не аказаўшы жанчыне дапамогу і не выклікаўшы «хуткую». Пры гэтым яго не спыніў ні бетонны плот могілак, ні жалезная агароджа адной з магіл.

### Схаваў скрадзенае ў трусы

У нядзелю днём у раённую бальніцу Вілейкі зайшоў мужчына. Падняўся на шосты паверх у рэанімацыйнае аддзяленне, пахадзіў па кабінетах і ў адным з іх з сумачкі медсястры выцягнуў 40 тысяч рублёў. «Нармальнага чалавека ў тую рэанімацыю ніхто не пусціць, а нейкага прайдзісвета — калі ласка, — кажа намеснік начальніка райаддзела міліцыі Андрэй Дударчык. — Ды яшчэ быццам бы для таго, каб наведаць хворага сябра».

Аднак калі злодзей з грашыма выходзіў з бальніцы, медсёстры западозрылі нядобрае. Спынілі яго, выклікалі міліцыю і трымалі да прыезду аператыўнай групы. Скрадзеныя грошы міліцыянты знайшлі ў... трусах затрыманага.

**БелаПАН; Сяргей Зянько, Рэгіянальная газета; ВЖ**

# Патоп на Нямізе

Карэспандэнт «НН» **Алесь Кудрыцкі** назіраў за паводкай у сталіцы, стоячы па калена ў вадзе.



Усё пачыналася як звычайная навальніца, а вылілася ў сапраўдны патоп. 24 ліпеня за паўгадзіны ў Мінску выпала амаль палова месячнай нормы ападкаў. Летапісная Няміга зноў ператварылася з вуліцы ў раку, а шэраг іншых сталічных скрыжаванняў — у сапраўдныя водныя артэрыі.

Аднаго погляду на чорна-фіялетавую хмару, якая навісла над Мінскам, было дастаткова, каб зразумець: будзе вялікая залева. Людзі на вуліцы прыспешвалі хаду, занепакоена пазіраючы ў набрынялае неба. Калі яно прарвалося першымі кроплямі, на пляцоўцы ля гандлёвага дому «Няміга» ўжо сабраўся вялікі натоўп цікаўных ды фотажурналістаў. Усе чакалі паўтарэння паводкі, якая здарылася тут за дзень да гэтага. Прырода чаканняў не падманула. Вуліца імкліва запаўнялася вадой. Зрабілася цёмна, нібы надвячоркам. Машыны рухаліся з уключанымі фарамі, шчодра пырскаючы вадою з-пад колаў ва ўсе бакі.

Неўзабаве людзі, якія схаваліся пад навесам на тралейбусным прыпынку, размешчаным каля Петрапаўлаўскага сабору, пачалі залазіць з нагамі на лаву, бо стаяць на зямлі было ўжо немагчыма. Небаракі! Яны не ведалі, што праз паўгадзіны іх будуць вывозіць адтуль на плытах супрацоўнікі МНС.

Вуліца Няміга на вачах ператваралася ў раку, закутую ў бетонныя берагі: з аднаго боку гандлёвы цэнтр, з іншага — новазбудаваны паркінг. Вада, не маючы выйсця, боўталася ў гэтым басейне, сплываючы ў бок Свіслачы. На ходніках вада стаяла па калена, а на праезнай частцы — дзе па пояс, а дзе і па грудзі. Вось кіроўца джыпа адчайна сунецца ў ваду, але мусіць спыніцца — насустрач прадзіраецца пасажырскі аўтобус. Раз-пораз праз залітую вадой Нямігу, нібы крэйсеры, праплываюць грузавыя «МАЗы», ад якіх ва ўсе бакі разыходзяцца магутныя хвалі, заліваючы машыны і людзей, якія хаваюцца ад залевы «на ўзбярэжжы».



Каламутная плынь вады на праезнай частцы была хуткай, нібы ў рацэ, — часам было складана ўтрымацца на нагах, у любы момант можна было паслізнуцца ды ўпасці.

У нейкі момант стварылася сапраўды небяспечная сітуацыя: вялікая маршрутка захрасла пасярэдзіне вуліцы. Чатыры супрацоўнікі МНС пачалі выносіць людзей на руках, дастаючы іх праз вокны. Дарэчы, на адным з ратаўнікоў была футболка з надпісам «МЧС России». Пасажыркамі былі спрэс прыгожыя дзяўчаты, так што выратавальная аперацыя глядзелася вельмі эфектна.

Крыху далей, каля Петрапаўлаўскага сабору, у водны палон трапілі два тралейбусы з пасажырамі. Пасажыраў з тралейбусаў эвакуявалі на адмысловых плытах выратавальнікі.

Паводка пакінула пасля сябе не толькі ржавыя рухавікі, сапсаваныя боты і залітыя крамы, але і шматлікія пытанні, адказаў на якія пакуль яшчэ няма. Напрыклад, не зусім зразумела, чаму рух на Нямізе спынілі гэтак позна, хоць перадугледзець, чым скончыцца залева, было вельмі лёгка. Чаму архітэктары, распрацоўваючы праект гэтай «звышсучаснай» вуліцы, спраектавалі такую неэфектыўную сістэму ліўневай каналізацыі? Але перакладаць усю віну на стыхію ці на дзяржаву таксама не выпадае. Напрыклад, нельга не здзівіцца кіроўцам, якія на злом галавы спрабавалі праехаць па безнадзейна залітай вуліцы, не шкадуючы ні сваіх аўтамабіляў, ні сваіх пасажыраў.

**Алесь Кудрыцкі**

**Патоп у горадзе: парады МНС**

1. Рэальна ацэньваць абставіны, у якіх апынуліся. Калі вы знаходзіцеся ў падземным пераходзе, трэба абавязкова з яго выйсці. Тое самае датычыць падвальных і цокальных памяшканняў будынкаў.

2. Не пакідайце машыны ў месцах, патэнцыйна небяспечных падчас моцных залеваў. Не пакідайце іх пад дрэвамі і самі старайцеся не знаходзіцца каля дрэваў, бо залевы звычайна суправаджаюцца моцнымі парывамі ветру.

3. Калі стыхія заспела вас у грамадскім транспарце, спрабуйце выбрацца самастойна ці выклікайце службу МНС па нумары 101. Само знаходжанне ў транспарце, які функцыянуе з дапамогай электрычнасці, бяспечнае, бо электраабсталяванне тралейбусаў і трамваяў знаходзіцца ў герметычных адсеках.

**ВЖ**

**Патоп у горадзе: парады пацярпелага**

1. У час залевы мы інстынктыўна спрабуем схавацца пад якім-небудзь навесам. Але насамрэч падчас паводкі большую небяспеку ўяўляе не тая вада, што ліецца з неба, а тая, што збіраецца на зямлі. Таму, хаваючыся ад залевы, шукайце найперш высокіх месцаў. Лепей стаяць пад дажджом, але на ўзвышку, чым плаваць па грудзі ў вадзе пад навесам на транспартным прыпынку.

2. Падземны пераход здаецца ідэальным месцам для таго, каб схавацца ад дажджу, але ён можа зрабіцца сапраўднай пасткай. Падчас апошняй залевы ў Мінску некаторыя падземныя пераходы цалкам заліло вадой — не дай Бог было там апынуцца дзіцяці!

3. На некаторых вуліцах вада не стаіць на месцы, а хутка плыве, таму важна за нешта трымацца, каб стаяць на нагах і не ўпасці. Будзьце асцярожныя — плынь вельмі лёгка можа сарваць у вас з ног абутак, асабліва калі гэта летнія «шлёпкі».

4. Калі вы, шкадуючы абутку, здымаеце яго і ідзеце басаногж, не забывайцеся пра тое, што ў каламутнай вадзе вельмі лёгка ўдарыцца аб прыступкі, наступіць на шкло. Важна не мітусіцца і крочыць спакойна, акуратна намацваючы нагамі цвёрдае дно.

5. Калі вы бачыце, што неўзабаве пачнецца моцная навальніца з дажджом, паспрабуйце абмінуць тыя вуліцы, якія перыядычна залліваюцца. Лепей згубіць на гэта свой час, чым паспрабаваць праскочыць на дурніцу, рызыкуючы апынуцца ў вадзяной пастцы.

**АК**

## Як выявіць «машыну-тапельніцу» падчас куплі?

Сотні машын былі затопленыя падчас залевы ў Мінску. «НН» пацікавілася, якія наступствы чакаюць уладальнікаў аўтамабіляў. На пытанні адказалі ў аўтацэнтры «Мультымотарс».

**— Чым пагражае поўнае пагружэнне машыны ў ваду, і ці можна пасля яе адрамантаваць?**

— Пагружэнне машыны ў ваду звычайна выклікае гідраўдар і няспраўнасць электрычных блокаў, таксама пасля ўзнікае карозія. Адрамантаваць такую машыну можна, але ступень рамонту залежыць ад ступені пашкоджання машыны.

**— Як выявіць затопленую машыну?**

— Трэба падняць дывановае пакрыццё: там павінныя быць сляды ад вады, таксама візуальна ацаніць якасць праводкі, правесці камп'ютарную дыягностыку, але дакладна ўстанавіць факт таго, што машына была залітая вадой, можна толькі разабраўшы машыну цалкам.

**Гутарыла Вольга Жарнасек**

**Колькі каштуе застрахаваць машыну ад стыхійнага бедства?**

Страхаванне, якое абавязкова робіць кожны ўладальнік аўтамабіля, дзейнічае толькі ў выпадках ДТЗ. Каб атрымаць грашовую кампенсацыю ад стратаў, якія нясуць «сюрпрызы» прыроды, машыну трэба страхаваць па ўласнай ініцыятыве. У сярэднім добраахвотнае страхванне аўтамабіля «АўтаКАСКА» (без уліку выпадкаў крадзяжу машыны) каштуе прыкладна ад 3,5 да 5% ад цаны аўтамабіля на год. Пры страхаванні ж ад усіх выпадкаў — яншчэ больш, ад 4,5 да 6% ад цаны.

**Геаграфія патопаў**

**Баранавічы**

У мінулым месяцы тут толькі чатыры дні былі без дажджу. 29 чэрвеня ў Баранавічах за дзве гадзіны выпала 59 мм ападкаў (дзве дэкадныя нормы). За гэтыя гадзіны ў горадзе зафіксавалі 5 ДТЗ.

19—20 ліпеня ў Баранавічах выпала найбольшая па краіне колькасць ападкаў (амаль палова месячнай нормы). Моцны вецер пакінуў без дахаў больш за 2000 дамоў. Не абышлося без ахвяраў: на возеры Свіцязь маланка ўдарыла ў дрэва, якое паваліласа на намёт. Загінуў 8-гадовы хлопчык.

26 ліпеня кепскае надвор'е стала прычынай ўсплёску аварыйнасці на баранавіцкіх дарогах: калі звычайна ў выходныя дні тут фіксуецца 3—4 ДТЗ, то ў мінулую нядзелю зафіксавалі 11.

**Гродна залівала двойчы**

Трапічны лівень 16 ліпеня за некалькі гадзін затапіў цэнтральныя вуліцы абласнога цэнтру. Месцамі быў паралізаваны рух грамадскага транспарту. Цікава тое, што напярэдадні па мясцовым тэлебачанні паведамлялася пра сухое і цёплае надвор'е. Ужо праз некалькі дзён, 19 ліпеня, Гродна заліло ізноў.

**Жлобін і Чачэрск: дзве месячныя нормы ападкаў за трое сутак**

Рэкордным на ападкі выпаў канец ліпеня для Жлобіна і Чачэрску. 24—26 ліпеня тут выпала 1,5—2 месячныя нормы ападкаў.

**Магілёў**

Цягам 26 і 28 ліпеня тут выпала 80% месячнай нормы ападкаў. Дажджом падтапіла сорак пяць прыватных дамоў і падвалы трох шматпавярховак. У некаторых раёнах Магілёўшчыны размыла дарогі. Былі затопленыя прыватныя і калгасныя палеткі.

**Слонім**

23 і 24 чэрвеня моцныя дажджы абрынуліся на горад. Ад стыхіі пацярпелі амаль усе мікраараёны Слоніма. 23-га ў Слонімскім раёне навальніца пакінула без святла 668 прыватных дамоў.

**СП**




# У Лукашэнкі нарадзілася ўнучка

**Для Ліліі Лукашэнка былі падрыхтаваныя спецыяльныя палаты ў звычайнай радзільні.**

У сям'і Ліліі і Віктара Лукашэнкаў **(на фота)** нарадзілася дачка. Гэтая падзея адбылася ў радзільні 5-й клінічнай бальніцы. Для парадзіхі былі выдзеленыя асобныя палаты ў агульным крыле. Астатніх парадзіх не надта турбавалі, хоць некаторыя меры бяспекі, як расказваюць відавочцы, былі забяспечаныя.

У размове з карэспандэнтам «НН» супрацоўнік лякарні выказаў усё ж незадаволенасць тым, што «камусьці забяспечваюць зусім эксклюзіўныя ўмовы».

Гэта ўжо трэцяе дзіця ў сям'і старэйшага сына кіраўніка Беларусі — у іх ёсць старэйшая дачка Вікторыя і сын Аляксандр.

Віктар і Лілія традыцыйна аддаюць перавагу радзільні 5-й клінічнай бальніцы, што месціцца ў будынку сярэдзіны мінулага стагоддзя. Тут з'явіліся на свет усе іх дзеці.

У сярэдняга сына прэзідэнта Беларусі — Дзмітрыя Лукашэнкі — дзве дачкі: Настасся і Дар'я.

Такім чынам, паводле наяўнай у адкрытым доступе інфармацыі, цяпер у Аляксандра Лукашэнкі пяць унукаў.

Звесткі пра асабістае жыццё і сем'і найвышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў у Беларусі закрытыя.

**Сяргей Мікулевіч**

# Ягор Хрусталёў меў дзве сям'і

**Каб падвесці рысу пад мінулым, ён пераехаў у Маскву. Другой яго жанчынай была спявачка Галіна Шышкова. У іх быў сын.**

Пра гэты былы генпрадусар АНТ прызнаўся пасля ад'езду ў Маскву. Фактычна ён пайшоў на гэты крок, каб аднавіць сваю першую сям'ю. Ён кінуў толькі збудаваны дом у Ждановічах і пераехаў працаваць на канал СТС. Пра ўсё гэта шоўмэн расказаў у інтэрв'ю «Комсомольской правде».

37-гадовы Хрусталёў так шмат разоў ставіў кропку на сваіх стасунках з Галяй Шышковай, што пра іх ужо расказваюць анекдот: «Хрусталёў — Шышковай: — Я ад цябе сыходжу. Шышкова: — Я з табой!»

Жонцы Жанне Ягор удзячны за цярпенне і мудрасць. «Калі б не Галя [Шышкова], я б не напісаў столькі песняў, не раскрыўся б як аўтар. З другога боку, калі б не яна, я б не прынёс столькі болю блізкім — маме, жонцы, дачцэ. Дый Галі, думаю, таксама было няпроста. Я шалёна ўдзячны Жанне [жонцы]. Яна цяпер побач, яна падтрымала мяне ў гэты няпросты перыяд».

Спявачка Галіна Шышкова дала свой адказ на інтэрв'ю былога генпрадусара АНТ. «Я не дазволю сабе гаварыць паскудствы пра чалавека, які з'яўляецца бацькам майго дзіцяці. Дарэчы, акурат дзякуючы яму з'явілася спявачка Галіна Шышкова, — прызналася яна ў інтэрв'ю «Салідарнасці», але пасля не вытрымала: «Ён увогуле жудасны баяка... Я б шмат расказала пра Ягора, але лепш прамаўчу, не буду тапіць яго канчаткова».

**Мікола Бугай**




**Ягор Хрусталёў з Галінай Шышковай.**

# Першы цалкам віленскі выпуск ЕГУ

У панядзелак 27 ліпеня ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (ЕГУ) адбыўся першы з часу існавання універсітэта ў Літве выпуск бакалаўраў. Беларускія ўлады выжылі ЕГУ з Беларусі, але ён адрадзіўся ў Вільні пры фінансавай дапамозе скандынаўскіх краінаў і Еўрасаюзу.

Віншаваў выпускнікоў і асабіста ўручаў дыпломы найлепшым бакалаўрам экс-прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус.

**Настасся Шамрэй, фота аўтара**



**Найлепшым студэнтам бакалаўрскага выпуску ЕГУ гэтага году быў прызнаны Алесь Патапенка, выпускнік праграмы «Медыі і камунікацыя».**




**Эксперты з міліцыі і пракуратуры ў сутарэннях глыбоцкай царквы.**

# Загадкі страшнай знаходкі

**Фотакарэспандэнтка «НН» Юлія Дарашкевіч спусцілася ў скляпенні глыбоцкай царквы, дзе нядаўна знайшлі чалавечыя парэшткі.**

З чацвярга ў царкве працавала сумесная следчая група з абласной віцебскай і Генеральнай пракуратураў Беларусі. Таму ні ў царкву, ні тым больш у сутарэнні царквы нікога не пускалі.

Па заканчэнні працоўнага дня некалькі чалавек усё-ткі здолелі трапіць уніз. Праўда, на самое месца знаходкі журналістаў не пусцілі. Затое паказалі ўсё астатняе — агромністыя сутарэнні, дзе багата іншых пахаванняў розных часоў. Яны знаходзяцца як пад нагамі, так і ў нішах сценаў.

На парэшткі прыкладна дваццаці чалавек, складзеныя разам, натрапіла моладзь Беларускай праваслаўнай царквы, прыбіраючы ў сутарэннях. Вакол знаходкі завіравалі версіі.

Пракурор Глыбокага Анатоль Сеўрукоў у інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс» сказаў, што няма падставаў меркаваць, што гэтыя людзі былі расстраляныя. Пахаванне ўвогуле можа адносіцца да часоў будаўніцтва храму, мяркуе ён. А яшчэ ў пачатку тыдня ён сцвярджаў процілеглае: гэта могуць быць парэшткі ахвяраў часоў Другой сусветнай. Гэтаксама памяняў сваё меркаванне і святар царквы.

Пракурорскія работнікі сцвярджаюць, што ні гільзаў, ні прыкметаў гвалтоўнай смерці пакуль не знойдзена.

Мясцовыя ж жыхары мяркуюць, што пахаванне можа датавацца і 1939 годам, а ляжаць там ахвяры савецкіх расстрэлаў. Побач з саборам тады месцілася сядзіба НКВД.

Студэнт Кастусь Шыталь кажа: «Я прыйшоў у сутарэнні на наступны дзень пасля таго, як пачалі адкопваць парэшткі. Адразу думалі, што яны належаць кармелітам. Але пасля выявілі кавалкі нястлелай вопраткі. Заўважна, што яна была пашытая на швейнай машынцы. А ў вопратцы знайшлі два пачкі ад цыгарэтаў вытворчасці варшаўскай фабрыкі «Прагрэс». Гэта дае падставы гаварыць пра пахаванне XX стагоддзя».

Яшчэ адзін відавочца, які пажадаў застацца невядомым, сведчыць пра знойдзеныя, праўда, у суседняй нішы, гільзы ад нагана і вінтоўкі Мосіна. А таксама кавалкі спаленых польскіх дакументаў, у тым ліку і вокладкі ад пашпарту.

22 ліпеня Глыбокае наведалі польскія дыпламаты. Прыязджалі першы сакратар пасольства Польшчы ў Беларусі Павел Марчук і начальнік консульскага аддзелу Кшыштаф Свідэрак. Яны сустрэліся з раённым пракурорам. 27 ліпеня польскае пасольства накіравала запыт па садзейнічанні ў высвятленні абставінаў смерці людзей.

Вынікі экспертызы будуць гатовыя праз месяц.

**Сяргей Макарэвіч, фота Юліі Дарашкевіч**

**Глыбоцкі сабор**

заснаваны ў XVII ст. Першапачаткова там быў манастыр кармелітаў. З 1878 году храм перадалі праваслаўным. У савецкія часы ў сутарэннях размяшчаўся склад кансервавага заводу.

**Віталь Каратыш** з-пад Лунінца і **Зміцер Жалезнічэнка** з Гомеля з гонарам вярнуліся дамоў. Гэтыя «палітрэкруты» — актывісты апазіцыі — трапілі ў армію ў 2008 годзе. **Франак Вячорка**, **Іван Шыла**, **Зміцер Хведарук** і іншыя працягваюць служыць. Кожны з іх у арміі захоўваў вернасць сваім дэмакратычным перакананням. І кожны з іх імкнуўся «беларусізаваць» армію. Гэта значыць, прынесці з сабой туды мову, нацыянальныя традыцыі — перадусім паводзінаў і стаўлення да людзей. Кожны рабіў тое па-свойму, у адпаведнасці са сваім характарам і одумам.

# Зміцер Жалезнічэнка-дэмбель: Я паўтара году таму і я цяпер — два абсалютна розныя чалавекі

Зміцер Жалезнічэнка дэмабілізаваны. З войска ён павінен быў выйсці толькі 25 ліпеня, але кіраўніцтва жлобінскай вайсковай часткі адпусціла яго на два дні раней, каб перадухіліць сустрэчу Змітра на КПП журналістамі, сябрамі, сваякамі. А 13 гадзіне Жалезнічэнка дабраўся да Гомеля, а яшчэ праз некалькі гадзінаў адказаў на пытанні «НН».



SVABODA.ORG

**«Наша Ніва»: З якім адчуваннем прынялі дэмбель?**

**Зміцер Жалезнічэнка:** Пакуль што такое адчуванне, што заўтра зноў прагучыць каманда «Рота, пад’ём». На дадзеным этапе няма ніякіх эмоцый. Хочацца проста адпачыць.

**«НН»: Войска будзеце згадваць добрым ці кепскім словам?**

**ЗЖ:** Ведаеце, я паўтара году таму і я цяпер — два абсалютна розныя чалавекі. Раней думаў, што буду згадваць толькі кепскім словам. Не тое каб эмоцыі былі станоўчыя. Хутчэй нейтральныя. Проста не хочацца згадваць пра службу.

**«НН»: А што дало войска?**

**ЗЖ:** Шмат дало. І станоўчага, і адмоўнага. Я незадоўга да дэмбелю нават склаў спіс. Напэўна, найперш армія навучыла трываласці. Усё ж раней у мяне такіх выпрабаванняў не было. Іншае стаўленне стала да маёмасці. Не стаў так перажываць, калі нешта забіралі, канфіскоўвалі. У войску прачытаў шмат кніжак. Калі вучыўся ва універсітэце, то шмат іх купляў, але не заўсёды паспяваў прачытаць. Цяпер навярстаў. Пачаў цаніць волю. Стаў дбаць пра выгляд. Раней мог хадзіць з нячышчанымі ботамі, а ў войску гэта было немагчыма. Стаў больш працавітым. Шмат чаго.

> Армія навучыла трываласці.

**«НН»: Адчувалі падтрымку?**

**ЗЖ:** У войску ўсе кантакты абмежаваныя. Часам мог зайсці ў інтэрнэт. Зрэшты, я імкнуўся не атаясамліваць сябе рэальнага з тым медыйным персанажам, які фігураваў у СМІ.

**«НН»: Як складваліся стасункі з саслужбоўцамі?**

**ЗЖ:** Былі роўнымі. Канечне, спачатку былі нейкія праблемы са старэйшымі салдатамі, сяржантамі. Стараліся вырашаць гэтыя праблемы. Не скажу, што я з кімсьці цесна кантактаваў, большасць часу праводзіў за кнігамі.

**«НН»: Якія цяпер планы?**

**ЗЖ:** Хочацца працягнуць навучанне. У Беларусі мне гэта наўрад ці дазволяць зрабіць. Знайшоў магчымасць працягнуць навучанне за мяжой. Для гэтага трэба здаць тэсты. Буду рыхтавацца.

**«НН»: Што можаце параіць тым хлопцам, якія цяпер у войску?**

**ЗЖ:** Не расціскаць зубоў. Трымацца і чакаць. Адразу калі прыйшоў служыць, то ясна зразумеў, што войска толькі на паўтара году, а сумленне з табой назаўсёды. Дык вось, мне не сорамна за праведзены ў войску час.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

# Віталь Каратыш-дэмбель: Яны ніколі раней не бачылі апазіцыянера

Грамадскі актывіст Віталь Каратыш скончыў сваю службу ў ракетных войсках. Забраны «ў боты» ў ліку палітрэкрутаў, ён падчас службы балатаваўся ў дэпутаты палаты прадстаўнікоў. Як прайшлі салдацкія будні і што рабіць пасля дэмбелю, Віталь Каратыш рассказвае карэспандэнту «НН».



НАСТАССЯ ШАМРЭЙ

**«Наша Ніва»: Раскажы, калі ласка, з якімі адчуваннямі ты ішоў у войска?**

**Віталь Каратыш:** Было страшна. Сапраўды не ведаў, чаго чакаць ад мясцовых уладаў, што будзе далей. Забіралі мяне ў дзень рэгістрацыі маёй ініцыятыўнай групы. Патэлефанавалі з ваенкамату і папрасілі прыйсці. Я думаў, гэта звычайныя фармальнасці. А мяне экстранна правялі па кабінетах і ўручылі позву. Назаўтра я быў ужо ў «ботах».

**«НН»: Калі ехаў у частку, як ты сабе ўяўляў войска?**

**ВК:** Калі ехаў, больш хваляваўся, як будзе працягвацца мая выбарчая кампанія. Увесь час на тэлефоне, каардынаваў збор подпісаў. Я не страчваў надзеі, што змагу вырвацца на выбары. Чым бліжэй пад’язджаў да часткі, тым больш рабілася страшна. Я думаў, калі мяне забіраюць настолькі гвалтоўна, не выключана, што мяне чакае вельмі суровая служба.

**«НН»: Як цябе сустрэлі салдаты?**

**ВК:** Нармальна. Салдаты збольшага не разумелі, у чым сітуацыя. Усе ведалі, што нейкая надзвычайная гісторыя з гэтым прызыўніком: цікавіліся, некаторыя спачувалі. А вось афіцэры і прапаршчыкі, хто быў у курсе справаў, ставіліся насцярожана. Яны ж ніколі раней не бачылі апазіцыянера. Было цікава: якія погляды ў мяне, чым займаюся, як насамрэч выглядаюць апазіцыянеры, пра якіх кажуць па тэлебачанні.

**«НН»: Як у цябе атрымалася сумясціць выбарчую кампанію і службу ў войску?**

**ВК:** Пакуль я служыў першы месяц, мая ініцыятыўная група сабрала подпісы, і мне заставалася толькі зарэгістравацца кандыдатам у дэпутаты. Гэта трэба было зрабіць непасрэдна мне ў акружной камісіі Лунінца. Але згодна з вайсковым статутам мяне мелі права не адпусціць. Толькі дзякуючы інфармацыйнай хвалі, якую паднялі СМІ, пра «салдата-кандыдата ў дэпутаты», мне далі магчымасць з’ездзіць і зарэгістравацца.

> Мне даводзілася быць нібы перакладчыкам з мовы незразумелых палітычных і эканамічных лозунгаў на людскую мову.

**«НН»: Як цябе праводзілі на выбары саслужбоўцы і як сустрэлі з пройгрышам?**

**ВК:** Мяне праводзілі, жадалі поспехаў і перамогі. Дзяліліся, што хацелі б змяніць у нашым заканадаўстве. Цікавіліся сістэмай, як стаць дэпутатам, запытвалі ці буду я далей прарывацца ва ўладу, прапаноўвалі дапамогу ў наступных выбарах — усім было цікава са мной паразмаўляць.

**«НН»: Якія самыя цікавыя міфы пра апазіцыю ты чуў ад салдатаў?**

**ВК:** Ад салдатаў такіх міфаў не гучала. Яны слаба ўяўлялі, што такое апазіцыя. А вось з боку афіцэраў і прапаршчыкаў чуў крыўдныя стэрэатыпы. Зрэшты, яны збольшага маюць рацыю. Напрыклад, што апазіцыя не здольная аб’яднацца, а што ўжо будзе, калі прыйдзе да ўлады. Мне было сорамна за гэта. Але спадзяюся, што здолеў пераканаць людзей, што ў апазіцыі хапае разумных асобаў, здатных удзельнічаць у кіраванні.

**«НН»: Ці прапаноўваў вайсковым сябрам далучыцца да тваёй палітычнай дзейнасці?**

**ВК:** Агітацыі не праводзіў. Я проста паказваў усім сваю пазіцыю, з якой там усе былі згодныя. Пазіцыя нашай апазіцыі даволі зразумелая, проста выказваюць яе чамусьці на незразумелай людзям мове. Мне даводзілася быць нібы перакладчыкам з мовы палітычных і эканамічных лозунгаў на людскую мову. А калі простымі словамі я расказваў, большасць была з усім гэтым згодная.

**«НН»: Служба скончылася. Што ты збіраешся далей рабіць?**

**ВК:** Збіраюся вучыцца ў магістратуры і рыхтавацца да наступнай выбарчай кампаніі (на мясцовых выбарах). Але найбольш хочацца пабачыць маці, паказацца аднавяскоўцам. Яны праз матулю перадавалі ў войска сала, адна бабулька падарыла ў дарогу малітву. Адпачываць буду нядоўга, некалькі дзён. Столькі задумаў! Хочацца як мага хутчэй пачаць грамадскае жыццё.

**Гутарыла Настасся Шамрэй**



### Салдат пакараны за ўжыванне беларускай мовы ў войску

23 ліпеня Франаку Вячорку вынесенае дысцыплінарнае спагнанне, перадугледжанае арт. 49 Дысцыплінарнага статуту: змяншэнне адпачынку за ўвесь перыяд вайсковай службы да пяці сутак (наступнае па жорсткасці пакаранне — гаўптвахта). Бацька салдата, Вінцук Вячорка, цвердзіць, што Ф.Вячорка пакараны за ўжыванне каманды па-беларуску — «Зважай!» замест «Смирно!». Ініцыятыва пакарання належыць псіхолагу в/ч №48694 старшаму лейтэнанту Дзянісу Казаку і намесніку камбата па ідэалогіі маёру Уладзіміру Ігнацюку.

Маёр Ігнацюк, у сваю чаргу, заяўляе, што з мовай пакаранне ніяк не звязанае: «Не за мову. Ён не выконваў патрабаванні артыкулаў 17—25 Страявога статуту і быў пакараны за нетактоўныя паводзіны са старэйшым па воінскім званні, а таксама за невыкананне артыкулаў статуту Унутранай службы. У яго там цэлы комплекс парушэнняў. Матэрыялы ўсе ёсць, і калі бацьку гэта цікавіць, ён можа пад’ехаць у любы момант і паглядзець».

Вінцук Вячорка заяўляе, што будзе звяртацца ў пракуратуру ў сувязі з моўнай дыскрымінацыяй сына.

**МБ;цыт. радыё «Свабода»**




# II. Славяне-рабы? Загадкавыя венеды. Балцкія абшары. Мужчынскія гены — славянскія, а жаночыя — балцкія?

Раздзелы з новай кнігі гісторыка **Алега Дзярновіча** на старонках «НН». Працяг. Пачатак у №26.

## Славяне

Першыя бясспрэчныя згадкі пра славянаў у пісьмовых крыніцах мы знаходзім толькі ў VI ст. н.э., у візантыйскага гісторыка Пракопія Кесарыйскага. Ён піша пра «склавенаў» у сваёй працы «Вайна з готамі» (536—537 г.). Сучаснік Пракопія, гоцкі гісторык Іярдан у кнізе «Пра паходжанне і дзейнасць гетаў» (551 г.) таксама піша пра «склавенаў» ды ўдакладняе, што яны насяляюць абшары паміж Карпатамі, Віслай і Дняпром на ўсходзе. Але большая частка тэрыторыі Беларусі ў эпоху Вялікага перасялення народаў ў арэал рассялення славянаў не ўваходзіла. Яны тады абжылі толькі самы поўдзень Берасцейшчыны.

Адна з верагодных тэорый паходжання назвы «славяне» звязвае яе з праславянскім коранем «слоў», што меў значэнне «мова». Такім чынам, этнонім (саманазва народа) мог узнікнуць як проціпастаўленне назве «немцы» (ад слова «нямы»), якое славяне выкарыстоўвалі для пазначэння паўночных суседзяў, германскіх плямёнаў, якія размаўлялі на незразумелай славянам мове.

Але гэтая версія прымаецца не ўсімі лінгвістамі. Некаторыя сцвярджаюць, што назвы народаў не -ене, -яне звязаныя з назвамі мясцовасцяў або рэк, а не з абстрактнымі паняццямі. Тут адкрываецца шырокая прастора для пошуку гэтых рэчак...

Славянскія палонныя ў раннім Сярэднявеччы часта рабіліся аб’ектамі візантыйскага, германскага і арабскага гандлю рабамі. Яшчэ ў IX ст. большая частка рабоў, якія траплялі на еўрапейскія рынкі, мелі славянскае паходжанне. Заходнееўрапейскія мовы добра ілюструюць гэтую з’яву. Ад племяннай назвы славян у грэцкай мове было ўтворана назва рабоў — сярэднягрэцкае (візантыйскае) *σκλάβος*, адсюль познелацінскае *sclavus* (раб, славянін), нямецкае Sklave, французскае *esclave* і г. д.


Старажытныя прусы, як бачна з гэтай выявы, насілі кілты накшталт шатландскіх.


Славянскае гарадзішча на рацэ Менцыля Мінску.


Такія пацеркі насілі старажытныя славянкі.


Бронзавае скрыневае колца V—VIII стст. з гарадзішча Баронікі каля Віцебска.

## Венеды

У пытанні паходжання склавенаў і антаў, пра якіх згадвае гот Іярдан, існуе нейкае паразуменне між гісторыкамі. Першых разглядаюць як заходнюю частку славян, другіх — як усходнюю. Але Іярдан пісаў яшчэ пра венедаў. І тут ужо згоды няма. Паводле Іярдана венеды, гэтае шматлікае племя, «вартае пагарды праз іх узбраенне», мела нейкую сувязь і са склавенамі, і з антамі. У канцы ж I ст. н. э. Тацыт пісаў пра венедаў як пра валацугаў, падобных да рабаўнікоў. У адрозненне ад сарматаў-качэўнікаў, венеды Тацыта ваявалі пешшу, прыкрываючыся шчытамі.

У савецкія часы стала кананічным залічваць венедаў да славян. Вельмі важнай венедская тэма застаецца для славенскіх гісторыкаў, якія наўпрост выводзяць ад іх генеалогію свайго народа. Беларускі гісторык Сяргей Рассадзін настойвае, што «Іярданавых венедаў» зусім не варта блытаць з больш раннімі, асабліва з Тацытавымі. Рымскія ж аўтары не мелі адзінства думак у этнічных характарыстыках венедаў. Напрыклад, Юлій Цэзар у сваіх «Занатоўках пра гальскую вайну» лічыў венедаў, што жылі на ўзбярэжжы Балтыкі, адным з гальскіх (кельцкіх) плямёнаў. І характарызаваў іх як выдатных мараходаў і карабелаў, дарэчы. Магчыма, варта разглядаць старажытных венедаў/венетаў як змяшаную этнічную супольнасць з выразнай прысутнасцю кельтаў альбо як племя, што сфармавалася ў перыяд балта-славянскага размежавання.

**Беларусы пераважна належаць**

да генетычнай групы R1a. Продкі яе прадстаўнікоў выжылі пасля Паазёрскага зледзянення (18—17 тыс. гадоў таму) і 6—8 тыс. гадоў таму развілі індаеўрапейскую экспансію з Паўночнага Прычарнамор’я.

## Балты

Такія звыклыя нам сёння назвы *балты* і *балцкія мовы* з’явіліся толькі ў XIX стагоддзі. Яны былі прапанаваныя як навуковыя тэрміны нямецкім лінгвістам Георгам Насельманам у 1845 г. Першая ж пісьмовая прыгадка гэтай супольнасці належыць рымскаму гісторыку Тацыту. У сваёй працы «Аб паходжанні германцаў» (98 г. н.э.) ён назваў народы, якія жылі на поўдзень ад Венедскага (Балтыйскага) мора *эстыямі* (лац. *aestii*). Толькі праз тысячу гадоў назва «эсты» пачала замацоўвацца за угра-фінскім народам на паўднёва-ўсходнім беразе Балтыкі.

На сёння землі, занятыя народамі, якія гавораць на балтыйскіх мовах, складаюць усяго шостую частку той тэрыторыі, якую займалі балты да славянскіх і нямецкіх уварванняў. Колішні балцкі абшар разлягаўся ад Прусіі на захадзе да вытокаў Акі на ўсходзе, дзе па суседстве з волжскімі фіна-уграмі жыло ваяўнічае племя *галіндаў* (*голядзь* рускіх летапісаў). Тэрыторыя сённяшняй Беларусі знаходзілася ў сэрцы балцкага культурнага арэалу. На бронзавых дзвярах кафедры ў вялікапольскім Гнезне, помніку раманскага стылю XII ст., захаваліся выявы прусаў — яны безбародыя, але з вусамі, валасы іх падстрыжаныя. Апранутыя прусы ў кілты.

Яшчэ ў канцы XIX ст. дацкі лінгвіст Вільгельм Томсэн, які даследаваў балцка-фінскія ўзаемаўплывы, паказаў, што ў фінскіх мовах маюцца пазычанні з балцкіх і датычаць яны назваў жывёл, раслін, частак цела, колераў, катэгорыяў часу. Гэтыя пазычанні паказваюць, якую вялікую колькасць навінак прынеслі балцкія індаеўрапейцы на паўночныя землі.

## Экспансія

Усё ж развіццё культуры мае супярэчлівыя шляхі. Для прагрэсу і ўстойлівасці патрэбныя як традыцыі, так і навацыі. У гістарычную эпоху (час, згадкі пра які засталіся ў пісьмовых крыніцах) балты апынуліся ўбаку ад асноўных маршрутаў міграцый. Яны захавалі архаічныя формы побыту і вялі адасобленае жыццё ў лясах. Калі ж пад ціскам печанегаў, булгар і асабліва авараў славяне пачалі пранікаць у землі заходніх балтаў і фіна-ўграў, яны не сутыкнуліся тут з належным адпорам.

Няма яснай карціны, як славянская экспансія выглядала на пачатковым этапе. Надта нязначная колькасць знаходак славянскіх пахаванняў і паселішчаў у балцкіх культурах Беларусі канца I тысячагоддзя. Самыя вядомыя з іх — гарадзішчы Банцараўшчына (Мінскі раён) і Калочына (Глускі раён).

Бясспрэчна славянскімі лічацца помнікі Пражскай культуры, выяўленыя зноў-такі на самым поўдні краіны — па Прыпяці і Ясельдзе. Тагачасная славянская цывілізацыя выглядае досыць сціпла: славяне жылі ў паўзямлянках, заглыбленых у грунт на 0,5—1,2 м. Бедным быў іх інвентар. У балтаў жа ў той час быў распаўсюджаны іншы тып жытла — наземныя пабудовы са слупоў. Як сапраўдныя сыны лясоў балты маглі дазволіць сабе больш камфорту.

Славянскае пранікненне на поўнач, углыб балцкіх тэрыторый, адбывалася не без канфліктаў. Сведчаннем жорсткіх сутычак з’яўляюцца знішчаныя балцкія гарадзішчы, якія часам знаходзяць археолагі. Але ў цэлым і для новых жыхароў знаходзілася дастаткова вольнага месца. Як піша Георгій Штыхаў, «чым далей славяне прасоўваліся на поўнач і паўночны ўсход, тым больш было неасвоеных земляў, нявысечаных лясоў, незанятых поймаў рэк».

## Генетычныя звесткі

Вось толькі наколькі маштабным было славянскае «нашэсце»? Традыцыйна лічыцца, што прышлыя славяне прышчапілі мясцовым балтам сваю мову і часткова культурныя здабыткі. Апаненты гэтай тэорыі сцвярджаюць, што славянскае пранікненне было вельмі малалікім, але славяне здолелі стварыць дзяржаву. І ўжо праз яе адміністрацыйна-рэлігійны прэсінг змяніць моўна-культурны ландшафт краю.

Адны археалагічныя звесткі не даюць адказу на пытанне, наколькі продкі беларусаў — славяне з паходжання. Меркаваць па знойдзеных рэчах (нават такіх як кераміка, дзе была моцная традыцыя вырабу) — рызыкоўна.

Ёсць цікавы спосаб — даследаванне генетычных матэрыялаў. Найпаўнейшыя звесткі можна атрымаць праз паралельны аналіз асноўных тыпаў генетычных маркёраў — Y-храмасомаў і мітахандрыяльных ДНК.

Y-храмасома забяспечвае толькі бацькоўскую лінію перадачы спадчыннай інфармацыі (сыну — ад бацькі, яму — ад ягонага бацькі і г.д.). У апошнія гады было праведзенае сумеснае беларуска-расійскае даследаванне па вывучэнні генафонду беларусаў. Аўтары гэтай працы змясцілі беларусаў паводле Y-храмасомы менавіта сярод кола славянскіх народаў — заходніх і ўсходніх. Беларусы пераважна належаць да генетычнай групы R1a. Продкі яе прадстаўнікоў выжылі пасля Паазёрскага зледзянення (18—17 тыс. гадоў таму) і 6—8 тыс. гадоў таму развілі індаеўрапейскую экспансію з Паўночнага Прычарнамор’я. Гэта дало падставы некаторым гісторыкам, напрыклад, Вячаславу Насевічу, заявіць, што канцэпцыя балцкага субстрату ў этнагенэзе беларусаў пахаваная.

Але не ўсё так адназначна. Аўтары згаданага даследавання менавіта паводле маркёраў Y-храмасомы выявілі генетычную супольнасць, якая ахоплівае тэрыторыю ад Польшчы да захаду Цэнтральнай Расіі і ўключае ў сябе Беларусь. Але ж гэта ў значнай ступені рэгіён балцкай гідраніміі!

Яшчэ адзін найважнейшы генетычны маркер — мітахандрыяльная ДНК — забяспечвае перадачу спадчыннай інфармацыі толькі па лініі маці (дочкі атрымліваюць гэтыя гены толькі ад маці, яна — ад сваёй маці, і так бесперапынна на працягу тысячагоддзяў). Дык вось, паводле мітахандрыяльнай ДНК сучасныя беларусы падобныя як да балтаў, так і да славянаў. У сувязі з чым была сфармуляваная гіпотэза, што жаночыя гены былі перададзеныя ад больш старажытнага субстрату, у той час як мужчынскія храмасомы адлюстроўваюць славянскую экспансію і міграцыю галоўным чынам мужчынскай часткі славянскага насельніцтва.

Калі гэтыя выкладкі слушныя, то паходжанне беларусаў сапраўды варта звязваць з удзелам як балтаў, так і славян. Але ж не трэба забывацца, што культура — не біялогія. Тут дзейнічаюць іншыя механізмы ўтварэння. І сюрпрызаў і трансфармацый можа быць не менш.

У наступным выпуску «Гісторыі Беларусі» чытайце пра драматычныя падзеі на мяжы I і II тысячагоддзяў н. э.

# Інстытут Піскуноў

**Першы электронны граматычна-парадыгматычны слоўнік беларускай мовы «Парадыгма» адкрыты ў свабодным доступе на сайце pravapis.tut.by. Вялізную працу зрабіла група энтузіястаў.**



**Фёдар Піскуноў — сціплы творца вялікае кампутарнае справы.**

Гэты «спуск на сеціва» адбыўся 14 ліпеня. Слоўнік распрацавала творчая група пад кіраўніцтвам навуковага супрацоўніка Фізічна-тэхнічнага інстытуту НАН Беларусі Фёдара Піскунова.

Слоўнік утварае адзіны праграмны комплекс з праграмай праверкі арфаграфіі «Літара». Гэты праграмны комплекс забяспечвае зручную працу з беларускамоўнымі тэкстамі як у працэсе іх стварэння, так і падчас апрацоўкі (чытання, праверкі, рэдагавання). Лексічны склад слоўніка — больш за 134 тыс. словаў.

— Праграма праверкі арфаграфіі — гэта толькі арыентыр для карыстальніка, які прымушае яго засумнявацца, палезці ў слоўнік, адпаведную даведку для сябе зрабіць, — кажа Фёдар Піскуноў. — Таму з'явілася ідэя, каб праверка арфаграфіі і слоўнік з даведкамі былі ў комплексе, — гэта ж натуральна.

**«НН»: На якія аналагі вы арыентаваліся, ствараючы слоўнік?**

**ФП:** Якраз у той час ішла праца з электронным слоўнікам Украіны. Там гэта ішло з вялікім размахам, быў прыняты ўказ прэзідэнта Кучмы, вялікая рэкламная кампанія. «Парадыгма» зробленая на ўкраінскі ўзор, але ўдасканаленая.

Электронны слоўнік Украіны — гэта фактычна вялікая табліца. Але калі ў тэксце сустракаецца слова не «пісаць», а «пішу» — праграма ў ступары. А «Парадыгма» адразу планавалася як дапаможны сродак для атрымання граматычных даведак. Карыстальнік атрымлівае пералік усіх формаў. Напрыклад, націсне ён на слова «душу», атрымае душа, душ, душыць і г. д. Акрамя таго атрымае ўказанне, дзе ставіць націск, і пабачыць усе формы гэтага слова.

У «Парадыгме» перадугледжаныя яшчэ і альтэрнатыўныя формы словаў.

Напрыклад, да слова «есці» яна прапануе абодва літаратурныя варыянты: і [мы] «ямо», «ядзім», [вы] «ясце» і «ядзіце».

**«НН»: Ці працуе «Парадыгма» ў розных варыянтах правапісу?**

**ФП:** Сама «Парадыгма» цяпер толькі афіцыйным правапісам. Гэта звязана з рухамі, якія адбыліся на прававым полі. Але я не буду супраць, калі хтосьці зробіць варыянт тарашкевіцай.

**«НН»: «Парадыгма» ўлічвае новыя правілы афіцыйнага правапісу?**

**ФП:** Пакуль у інтэрнэце змешчаны варыянт па дзейных правілах мовы. Вось як уступяць новыя правілы ў сілу, «Парадыгма» будзе мяняцца. Гэта пытанне некалькіх дзён, каб унесці тыя змены.

Ва Украіне аналагічныя прадукты рыхтаваліся згодна з указам прэзідэнта Кучмы, вялікімі ўкладаннямі.

**«НН»: Мова развіваецца, з'яўляюцца новыя словы. Ці ёсць у слоўніку наватворы ці кампутарныя тэрміны, напрыклад?**

**ФП:** Я, як кажуць у шахматах, зраблю ход канём і спашлюся на вашае выданне, якое ў гэтым плане мабільнае. У аснову слоўніка былі пакладзеныя не толькі слоўнік Бірылы, але і корпусы тэкстаў газеты «Звязда» і «Нашай Нівы». Думаю, шмат словаў, якія адлюстроўваюць новыя рэаліі, увайшло ў слоўнік.

**«НН»: Раскажыце пра тэхнічныя магчымасці «Парадыгмы». З якімі праграмамі і аперацыйнымі сістэмамі яна стасуецца?**

**ФП:** Пакуль я магу выказацца ўпэўнена толькі наконт сістэмы XP і Microsoft Word 2000—2003. Думаю, што хутка хтосьці абавязкова паспрабуе прыстасаваць «Парадыгму» да Microsoft Office-2007.

Што датычыць праграмы праверкі арфаграфіі «Літара», то яна дакладна не працуе ў Microsoft Office-2007. Гэта звязана з тым, што «Майкрасофт» памяняў сваю тэхнічную палітыку і абсек магчымасці самастойным праграмістам аперавадь з іх прадуктамі. Таму, каб пад Microsoft Office-2007 зрабіць «Літару», трэба афіцыйна атрымаць ад кампаніі дазвол. Але я не страчваю надзеі, што хто-небудзь возьмецца за гэтую справу, і «Літара» з «Парадыгмай» у комплексе будуць працаваць на любым кампутары з рознымі сістэмнымі патрабаваннямі.

**«НН»: Якую праграму можна чакаць ад Вас наступнай?**

**ФП:** Буду займацца ўдасканаленнем. Думаю, як дадаць тлумачальную частку. То бок не толькі даваць парадыгму слова, як яно скланяецца і гэтак далей, а і ў нейкім адмысловым акенцы падаваць значэнне. Думаю, гэта будзе карысна для больш зручнай працы з беларускамоўнымі тэкстамі.

Я спадзяюся, што мае будучыя распрацоўкі будуць такімі ж папулярнымі, як і мінулыя. Праграма можа жыць, толькі калі будуць у яе карыстальнікі і калі будзе зваротная сувязь. Калі няма зваротнай сувязі, то і імпэт будзе слабець у распрацоўшчыкаў.

**Гутарыла Настасся Шамрэй**

## Вайцюшкевіч напіша песні на словы Арлова

Спявак адзначыў дзень народзінаў традыцыйным канцэртам у коле сяброў. Кола сяброў у яго вялікае, таму канцэрт адбыўся ў канцэртнай залі «Мінск».

Першымі павіншавалі Змітра ўдзельнікі гурту «Гуда». Яны заспявалі некалькі песняў і падаравалі пас ручной работы.

Зміцер жа падараваў у адказ песню «Спі-засні, вулканянёлак» на вершы Арцёма Кавалеўскага. У хуткім часе з'явіцца альбом, які будзе ўключаць 21 песню на вершы гэтага аўтара. Гэта пазітыўныя песні для дзяцей і не толькі.

Праспяваўшы яшчэ некалькі песняў, Вайцюшкевіч запрасіў на сцэну гурт «Зімовая вайна з Тыбетам». Пасля выступлення гурту музыка заўважыў, што ў працяг будыйскай тэмы нічога іншага не прыходзіць у галаву, акрамя блатняку, і зацягнуў «Ірку Ермалінскую».

Большасць песняў, выкананых падчас канцэрту, напісаныя на вершы Уладзіміра Някляева, які, дарэчы, прысутнічаў на канцэрце. Апошні ў канцы канцэрту павіншаваў са сцэны імянінніка і праспяваў сваю версію «Іркі Ермалінскай», чым сарваў бурныя апладысменты гледачоў.

Акрамя вышэйназваных павіншаваць Змітра прыйшлі пісьменнік Уладзімір Арлоў, бард Алесь Камоцкі, бізнэсмэн Зміцер Папоў, гурт «Босае сонца», Ксенія Мінчанка.

Уладзімір Арлоў заявіў, што хацеў бы, каб Зміцер Вайцюшкевіч калі-небудзь напісаў песню на ягоныя вершы. Менавіта з гэтай прычыны ён і стаў пісаць у рыфму. «Зміцер кажа, што ў маіх вершах шмат нехарошых словаў, на такія вершы песні не пішуцца, таму я цяпер стараюся пісаць вершы, дзе было б меней нехарошых словаў», — пажартаваў Арлоў.

Хаця дзень нараджэння быў у Змітра Вайцюшкевіча, падарункі атрымаў не толькі ён сам, але і ўсе ўдзельнікі канцэрту.

Музыка падараваў кожнаму выступоўцу дыск караоке «Спявай, васількова край!» На дыску запісаная музыка 36 песняў Вайцюшкевіча.

**Таццяна Печанко, «Будзьма беларусамі!»**



## Гэтыя вочы блакітныя, глыбокія

24 ліпеня споўнілася 75 гадоў народнаму артысту Беларусі — купалаўцу Генадзю Гарбуку. За плячыма ў яго — амаль сотня тэатральных роляў, дзесяткі працаў у кіно. Гарбук — гэта Васіль у спектаклі і фільме «Людзі на балоце» І. Мележа, Сымон у «Раскіданым гняздзе» Янкі Купалы, Пятрок у «Знаку бяды».

Гарбук нарадзіўся ў вёсцы Глыбачцы Ушацкага раёну.

Артыст Віктар Манаеў кажа пра свайго старэйшага калегу: «Гэта шчасце, што ў Купалаўскім тэатры ёсць такія акторы як Гарбук, — яны з Генадзем Аўсяннікавым «апошнія з магікан», тых сапраўдных купалаўцаў, якія захоўваюць трапяткое стаўленне і да сцэны, і да справы, і да прафесіі.

А Гарбук — гэта наагул увасабленне беларускага народа, беларускага характару — вось менавіта праз глыбіню блакітных вачэй Гарбука (я маю на ўвазе яго народнасць)».

**Паводле радыё «Свабода»**

## СЦІСЛА

### Вітаўт, Радзівіл Чорны і князь Васількавіч

У Брэсце ў межах свята 990-годдзя гораду адбылося адкрыццё скульптурнай кампазіцыі. Гэта трох'ярусны помнік вышынёй 10 метраў. На ніжнім ярусе 12 бронзавых шыльдачак. На шыльдачках згаданыя найбольш значныя падзеі гісторыі Брэста. Вышэй размешчаныя шэсць бронзавых фігур гістарычных дзеячаў — Вітаўта, Радзівіла Чорнага, князя Васількавіча і зборныя вобразы — Маці, Салдата і Летапісца. Над імі ўзвышаецца фігура Анёла-ахоўніка. Кампазіцыя распрацаваная брэсцкім скульптарам Аляксеем Паўлючуком.

### Памёр а. Ян Абабурка

У Вялікабрытаніі 23 ліпеня на 88-м годзе жыцця памёр адзін з заснавальнікаў Згуртавання беларусаў Вялікабрытаніі — айцец Янка Абабурка. Ён апекаваўся прыходамі Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў Манчэстэры, Брэдфардзе, Нотынгеме, Бірмінгеме, Лондане, Кембрыджы.

**БелаПАН; радыё «Свабода»**

# У сэрцы Вялікай Літвы

## Шчорсы і вёскі Боны Сфорцы

**Першая сталіца ВКЛ**

Гістарычны дух, не вытручаны гадамі змагання з «перажыткамі мінулага», вабіць у Наваградак тысячы людзей. На старажытным замчышчы, пад старымі мурамі, пачынаеш глядзець на Беларусь іншымі вачыма. У горадзе дзеюць старыя касцёлы і адна са найстарэйшых праваслаўных цэркваў, а таксама мячэць беларускамоўных татараў. Тут дзейнічаюць Дом–музей Адама Міцкевіча і цудоўны гістарычна–краязнаўчы музей, які мае прысвечаную Барысу Кіту экспазіцыю. У Наваградку можна размясціцца на начлег у двух гатэлях, адзін з якіх прыватны.


PHOTO.BYMEDIA.NET

У дзяцінстве па дарозе на Наваградак да дзядулі з бабуляй мяне заўсёды вабілі таямнічыя пабудовы на выездзе са Шчорсаў. Дарослыя тлумачылі, што гэта руіны замку. Упершыню пешшу туды выбраўся разам з братам у 22 гады. Убачанае ясным студзеньскім днём на ўсё жыццё засталося ў памяці — не зламаныя часам абрысы старога парку, азёры, парэшткі фальварку, вяндлярня і, безумоўна, былая уніяцкая царква, збудаваная ўсюдыісным італьянцам Сака. Я даведаўся пра Храптовічаў, пра тое, што гэта і не замак зусім, а гаспадарчыя пабудовы, але Шчорсы назаўжды пакідаюць незабыўнае, асаблівае ўражанне.

Сёлета ў Шчорсы ехаў не па шашы, а вёскамі, якія з часоў каралевы Боны з роду Сфорца цягнуцца ланцужком да мястэчка ад самых Карэлічаў.

### Аграгарадок імя Храптовіча

Яшчэ да з'яўлення самога тэрміну «аграгарадок» мая родная вёска Краснае займела статус перспектыўнага паселішча. Новыя дамкі ў Красным пачалі будаваць гадоў пяць таму. За гэты час у вёсцы правялі газ, у каго яшчэ не было — ваду. Вуліцы заслалі новым асфальтам, абгарадзілі стандартнымі платамі, паставілі кантэйнеры для смецця і дарожныя знакі. «Толькі «зебраў» ды святлафораў не хапае!» — смяюцца аграгараджане. Да праяваў цывілізацыі не ўсе ставяцца належным чынам — замест побытавага смецця ў кантэйнеры скідаюць бульбоўнік ды лісце.

Каб набыць валюту, не трэба ісці ў райцэнтр — у вёсцы ёсць філіял «Беларусбанку». Наяўнасць канкурэнтаў-прыватнікаў змушае дзяржаўны гандаль сачыць за асартыментам. Дзесяць гадоў таму цяжка было ўявіць, каб у краме прадавалі філе хека, а цяпер — калі ласка!

Прыкра толькі, кажуць вяскоўцы, што з самой ідэяй аграгарадкоў спазніліся. «Маладыя паз'язджалі, для старых тыя газ ды вада ўжо мала што значаць», — кажа мой аднагодак. Утрымаць у вёсцы сённяшніх школьнікаў можа толькі добры заробак, упэўнены ён.

Да рэшты мінусаў можна аднесці татальнае змаганне з дрэвамі, якія без шкадавання павысякалі што ў вёсцы, што ўздоўж дарог. Старыя вербавыя прысады, пасаджаныя яшчэ за палякамі, знікаюць без дай прычыны.

### Ружы і дзікі вінаград

Руды ад іржы знак абвяшчае пра мяжу аграгарадка. За ім пачынаюцца «простыя» вёскі — Жукі, Востухава, Навашыно. Новы асфальт ёсць і тут, дарожныя знакі таксама, не хапае толькі новых дамкоў. А вось што моцна адчуваецца, дык гэта мізэрная колькасць маладых сем'яў у параўнанні з пасёлкам. Легкавікі пад плотам не лічацца — на двары лета, дзеці прывезлі ўнукаў да старых. Увагу забіраюць абшытыя сайдынгам хаткі. На сценах — спадарожнікавыя «талеркі».



СЯМЁН ПЕЧАНКО

Калі ў Жуках такія дамкі яшчэ не рэжуць вока, то ў Востухаве гэта дзіва. У моцным ланцугу сфорцаўскіх вёсак гэтая, праз чарнобыльскую трагедыю, стала слабым звяном. Некалі тут была мураваная школа са стадыёнам, куды на спаборніцтвы з'язджалася ўсё наваколле. Праз забруджванне школу давялося разабраць, нават грунт у кар'ер вывезлі. З таго часу маладзейшыя вывезлі сем'і хто куды, вёска занепала. Цяпер жа пакрысе пастарэлыя «ўцекачы» вяртаюцца, пакінуўшы дзецям гарадскія кватэры. Барбекю, густоўныя альтанкі і нават балконы, зашклёныя каляровымі шыбамі.

Яшчэ большы кантраст дэманструе Навашыно: вось стаіць моцная яшчэ, але зарослая дзікім вінаградам хаціна, а побач — адрамантаваны дамок з высаджанымі пад сценамі кустамі дэкаратыўных ружаў. Побач з адной з сядзібаў на беразе ўласнага азярца сярод бульбянішча вудзіць карасёў дзед. На плоце аднаго з двароў сіняй фарбай выведзена неасэнсаванае, магчыма, прывітанне аўтарцы Уставаў на валокі: Italia. Squadra Azzura. Forza Milan. Апошняе дачку міланскага герцага Джавані-Галеаца Сфорца магло б усцешыць асабліва.


СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Свіцязь**

Легендарнай чысціні возера, папулярнае месца адпачынку на сутыку Баранавіцкага, Карэліцкага і Наваградскіх раёнаў. Свае паслугі тут прапануе санаторый «Свіцязь», які належыць Беларускай чыгунцы. Можна сюды прыехаць і з уласным намётам.

### Шчорсы

Мястэчка сустракае раўнюткім асфальтам і малітоўным домам — тут жыве досыць шмат пратэстантаў. Здаля віднеецца царква. Збудаваная ў 1770—1776 гадах па праекце італьянскіх архітэктараў Джузэпэ Сака і Карла Спампані на месцы колішняй драўлянай, сённяшняя Дзмітраўская царква дамінуе над наваколлем. Пажарная вышка на іншым баку плошчы і савецкі помнік невядомаму салдату насупраць — ёй не канкурэнты. Побач з помнікам Леніну ўсміхаецца герой грамадзянскай вайны Мікалай Шчорс, які ніколі не быў у Шчорсах. Помніка канцлеру ВКЛ графу Яўхіму Храптовічу тут няма, як і Міцкевічу, які напісаў пад адным са шчорсаўскіх дубоў сваю «Гражыну».



**Сцежкамі Адама Міцкевіча**

Акрамя Наваградку аматарам творчасці вялікага паэта варта наведаць звязаны з жыццём творцы фальварак Завоссе, месца нараджэння вялікага паэта. Фальварак Адама Міцкевіча ў Завоссі, што побач з Баранавічамі, ўяўляе сабой музейны комплекс — драўляны дом гаспадароў і свіран, а таксама лямус — пабудову на два паверхі гаспадарчага прызначэння. Вартымі ўвагі будуць вандроўкі ў Варончу, Райцу, Карэлічы.

Ад шматлікай спадчыны Храптовічаў у Шчорсах засталіся падмуркі колішняга палацу, фрагменты флігеля, будынак знакамітай некалі бібліятэкі, вяндлярня, а таксама рэшткі гаспадарчых пабудоваў. У 1998 годзе кінарэжысёр Уладзімір Арлоў здымаў тут адзін з першых айчынных серыялаў «Пракляты ўтульны дом». Утульнасці тут не пабольшала: бібліятэка як стаяла без вокнаў, так і стаіць, дарма што на сцяне напісана «Жыве Беларусь!».


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Любча**

Мястэчка ў Наваградскім раёне. Каторы год штолета сюды прыязджаюць валанцёры на аднаўленне замку XVI ст. Замкам апякуюцца моладзевая грамадская арганізацыя «Гісторыка» і Фонд «Любчанскі замак».

Будынкі фальварку зарастаюць быльнягом ды пакрысе абвальваюцца. Трохі весялей справы з флігелем — у адным з яго памяшканняў працуе камерцыйная крама, у іншых жывуць людзі. Што да праклёну, то ён, пэўна, адрасаваны найперш мясцовым артэфактам мінулага.

Здавалася б, мястэчка магло б жыць з таго, што пакінула яму гісторыя, толькі давядзі да ладу тое, што ёсць. Не кажучы ўжо пра амбіцыйныя планы па аднаўленні графскага палацу. На гэта нібыта няма сродкаў. Затое ў Шчорсах забудавалі аградамкамі дзве вуліцы, што яскрава сведчаць пра прыярытэты сучасных «уладароў сяла». Тым не менш, хочацца верыць, што рана ці позна да адраджэння спрычыніцца хтосьці з мясцовых багатыроў. Падыходзячы да руінаў фальварку, мы пабачылі дарагое аўто, па дарозе ад напаўразбураных будынкаў да легкавіка ішлі гаспадары — маладая пара ў строгіх гарнітурах з нятанным фотаапаратам. Хто ведае...

**Сямён Печанко,**
**Шчорсы—Мінск**

**Свіцязянскія сядзібы — адпачынак на прыродзе**

**«Свіцязянка»**

Аматары адпачынку ў вёсцы могуць наведацца ў Варончу, што ў Карэліцкім раёне. Сядзіба «Свіцязянка» прапануе сваім гасцям тры пакоі ў добраўпарадкаваным доме. Побач з домам паркоўка. Кухня, сталоўка на 10 чалавек, санвузел, гарачая і халодная вада ў доме. Гаспадары гарантуюць экалагічна чыстае харчаванне. Пры сядзібе маецца вялікі сад. Дзеці могуць пабачыць хатніх жывёл і птушак. Аматары падарожжаў могуць замовіць экскурсіі ў Мір, Нясвіж, Жыровічы, на возера Свіцязь.

**«Залатая падкова»**

Сядзіба месціцца непадалёк ад возера Свіцязь у вёсцы Навасады Наваградскага раёну. Галоўная адметнасць тут — кузня. Госці сядзібы на свае вочы могуць пабачыць, як куюцца падковы, а то і атрымаць адну на шчасце ў падарунак. Тут ёсць невялікі мастацкі музей вышыўкі, іконаў, карцінаў. Для адпачынку прапануецца ўтульны дом, для аматараў адпачынку на вольным паветры ёсць пуня з сенам і пляцоўка для намётаў.




# Дарашкевіч і Грыц у Вільні

Народ існуе ў пэўныя эпохі і на пэўнай прасторы. І нават калі лёс раскідае яго па такой невялікай і такой велізарнай зямлі, у гістарычнай памяці пакаленняў будзе існаваць аповед пра тое, як і дзе жылі іх продкі.

Гады сціраюць дэталі. Унук не памятае, якой была хата, дзе былі шчаслівыя яго дзяды. І, урэшце, аповед ператвараецца ў аповед пра мінулае, што мінула беззваротна. Пазбаўленыя былой непасрэднасці, успаміны пакаленняў перастаюць выклікаць настальгію па тым часе і месцы, дзе быў шчаслівы цэлы народ.

Але дэталі фіксуе фотастужка, якая вяртае нашай памяці карціну таго, чаго мы, магчыма, ніколі не бачылі і дакладна ўжо не ўбачым. Міне дзесяць, дваццаць, трыццаць гадоў. І мы зноў апынемся ў тым месцы і ў тое імгненне, пах якога сніцца нам уначы.

Так пішацца гісторыя народа.

**Аляксандр Фядута**

Фотавыстава «Беларусь: час і месца» беларускіх фотарэпарцёраў Сяргея Грыца і Юліі Дарашкевіч працуе **ў Вільні ў памяшканні канферэнц-залі Музею ахвяраў генацыду (вул. Аўку, 2а)**. Выстава працягнецца **да 27 жніўня**.

## КАНЦЭРТЫ

**Канцэрты Андрэя Мельнікава**

Канцэрт-сустрэча з бардам Андрэем Мельнікавым пройдзе ў намётавым мястэчку **ля вёскі Раманавічы Гомельскага раёну 28 ліпеня. Наступная сустрэча — ля вёскі Брылі Аршанскага раёну Віцебскай вобласці 4 жніўня.** Месца выступу адметнае сваім размяшчэннем — гэта правы бераг Дняпра, дзе ў яго ўліваецца р. Крапівенка. Менавіта на гэтым месцы быў святочны канцэрт з нагоды Аршанскай бітвы ў 2007 годзе. **Пачатак у 19.40.**

**Сустрэча з Алесем Камоцкім**

Творчая сустрэча з бардам Алесем Камоцкім пройдзе **30 ліпеня 2009 года ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Музычны завулак, 5). Пачатак а 17-й.**

**Жывы Гук ON-line**

Другі фестываль «Жывы Гук ON-line» **31 ліпеня збірае сяброў у «Дворыку ЦДА» (калі абысці Дом афіцэраў справа і падняцца па стромай лесвіцы). Пачатак а 17-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Фестываль мастацтваў «ДАХ-9»**

Міжнародны фестываль мастацтваў «ДАХ-9» пройдзе **з 25 жніўня да 20 верасня ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3)**. На адной пляцоўцы будуць суіснаваць жывапіс і скульптура, фатаграфія і перформанс, літаратура і музыка, тэатральнае мастацтва і кіно, стрыт- і відэа-арт. У межах фестывалю будуць прадстаўленыя персанальныя і супольныя праекты беларускіх аўтараў, а таксама работы іх калегаў з Германіі, Нарвегіі, Італіі, Польшчы, Украіны, Расіі, Нідэрландаў, Японіі, ЗША і Ізраілю.

**І ажывае бяроста...**

**У галерэі «Славутыя майстры» (Камунальная, 6) да 15 жніўня** працуе выстава працаў Святланы Канстанцінавай «І ажывае бяроста...».

**Новая калекцыя**

**Да 15 жніўня ў галерэі «Славутасць» (Багдановіча, 21)** — выстава новай калекцыі Кацярыны Філюты. Яе яркія дэкаратыўныя працы актыўна ўздзельнічаюць у жыцці любога інтэр'еру, уздымаюць настрой і своеасабліва арганізоўваюць прастору.

**Памкненне**

**У музеі гісторыі беларускага кіно (Свярдлова, 4) да 15 жніўня** працуе выстава жывапісу, графікі і скульптуры Аляксандра Верашчагіна і Анатоля Сярчэні.

## ТЭАТРЫ

**30 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**Купалаўскі тэатр (малая сцэна)** — «Адчыніце кантралёру!»

**31 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**«Навальніца» феерверкаў**

**28—30 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск»** пройдзе першы міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца». Выступы еўрапейскіх піратэхнічных камандаў падтрымаюць музычныя гурты **«J:морс», «Ляпіс Трубяцкі», «Палац»**, а таксама ды-джэі. Сваё майстэрства пакажуць каманды з Францыі, Германіі, Чэхіі, Славакіі, Латвіі і Літвы. Фэст будзе ісці тры дні. У кожны з вечароў (20.00—23.30) запланавана па два конкурсныя выступы піратэхнічных камандаў, а таксама праграма жывой рок-музыкі. Пасля заканчэння вечаровай праграмы ў першыя два дні будзе яшчэ і «начная», падчас якой выступяць **DJ Top, DJ I.F.U., DJ Arsenti Tchouprina, DJ Shishkin, DJ Light PM**. У трэці дзень начной праграмы не будзе, затое гледачоў чакае гранд-феерверк ад беларускай каманды «Кальвін». Да пляцоўкі фестывалю можна дабірацца асабістым транспартам або на спецыяльным аўтобусе, які будзе курсіраваць да фестывальнай пляцоўкі ад ст.м. «Усход».




**Рок-фэст Be-Free пераносіцца ў Чарнігаў**

Арганізатары канчаткова вызначыліся з датай рок-фестывалю. Ён пройдзе **22—23 жніўня**. Выступы пройдуць **на беразе Дзясны на пляцоўцы паміж Паркам і гатэлем «Бранск»**. Доўжыцца праграма будзе **з 16.00 да 22.00 абодва дні**. Запланаваны ўдзел дзесяці гуртоў з Беларусі і шасці з Польшчы ды Украіны. З **«Ляпісам Трубяцкім»** і **«Воплямі Відаплясава»** вядуцца перамовы. Побач з месцам правядзення фэсту будзе арганізавана намётавае мястэчка.

Як дабрацца да Чарнігава

З Гомеля штодзённа а 6.43 адпраўляецца дызель. Дарога зойме тры з паловай гадзіны. З Гомеля можна дабрацца таксама аўтобусамі. 22 жніўня яны адпраўляюцца ў 7.00, 8.00, 10.20, 12.45, 14.00, 15.00, 16.05, 19.00. Таксама будуць арганізаваныя прамыя аўтобусы з Мінска. Ідуць праз Чарнігаў і хуткія цягнікі з менскага і жлобінскага кірункаў.

У папярэднія гады фэст праходзіў на захадзе Украіны — у гарадах Луцк і Львоў.

Дадатковая інфармацыя:
(+375 29) 649-08-88 (Віталь)
(+48) 516-58-88 63 (Марыя)

**Сяргей Макарэвіч**



**Свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета — 2009»**

**2 жніўня ў філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына»** адбудзецца традыцыйнае Свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета-2009». У вас будзе добрая нагода дакрануцца да высокай паэзіі ў выкананні аўтараў, ужо шырока вядомых і маладых, усцешыцца беларускімі песнямі і танцамі, а самае галоўнае, прайсціся сцежкамі слаўнага паэта Максіма Багдановіча, наталіць смагу з чыстай сцюдзёнай крыніцы, Максімавай крыніцы натхнення... Ладзяць свята Маладзечанскі райвыканкам і Літаратурны музей імя Максіма Багдановіча. **Пачатак а 12-й.** Як дабрацца? Праезд электрычкай Мінск — Маладзечна да станцыі Уша (вёска Краснае), потым недзе з кіламетр-паўтара пешкі, або аўтобусам у кірунку Чысці. Аўтобусы таксама адпраўляюцца ад чыгуначнай станцыі Уша. Адпраўленне з Мінску: 8.24, 9.14, 10.00, 11.11. Адпраўленне з Маладзечна: 8.44, 9.47, 11.09, 12.08. У Мінску, ад скрыжавання вуліц Кірава і Бабруйскай можна даехаць маршрутным аўтобусам Мінск — Краснае. Маршруткі апраўляюцца кожныя 40 хвілін. Ехаць да мястэчка Краснае, потым спытаць красненцаў, як дабрацца або на свята, або да Ракуцёўшчыны. Даведкі па т.: (01773) 96-1-41, (017) 334-42-69. E-mail: bagdanovich@tut.by, maksimbagdanovich@rambler.ru

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# За жменю даляраў

**Per un pugno di dollari** / A Fistful of Dollars

Італія — Іспанія — Заходняя Нямеччына, 1964, каляровы, 99 хв.

**Рэжысёр:** Сэрджыё Леонэ

**Жанр:** Вестэрн

**Адзнака:** 10 (з 10)




Маўклівы «Чалавек без імені», які трапна страляе, з'яўляецца ў памежным мястэчку Сан-Мігель, дзе ідзе вайна паміж сямейнымі кланамі. Герой наймаецца да абедзвюх груповак, але ў жыццё праводзіць свой план.

Легендарная карціна, класічная і пякучая, як куля. Доўгі час манапалістамі ў нацыянальным жанры вестэрну былі амерыканцы. Італьянец Сэрджыё Леонэ стварыў новы жанр — спагеці-вестэрн, які дасюль пераўзыходзіць арыгіналы. Цікава, што карціна пастаўленая па матывах самурайскага «Целаахоўніка» Акіры Курасавы. А японская стужка ў сваю чаргу ўзыходзіць да дэтэктываў Дэшыла Хэмета «Чырвонае жніво» і «Шкляны ключ».

Леонэ зняў карціну за «жменю даляраў» (200 тыс.) — на іспанскай натуры і сам схаваўся пад ангельскім імем, каб не адштурхнуць публіку, якая шчэ не прызвычаілася да італьянскіх вэстэрнаў. Мала каму вядомы на той час Клінт Іствуд пагадзіўся на прапанову італьянскага рэжысёра — і сам падбіраў адзенне для свайго героя: набыў чорныя джынсы ў спартовай краме, капялюш і цыгары. А вось фірмовае пончa прыдумаў для «чалавека без імені» Сэрджыё Леонэ.

Буйныя планы, дэталі, эфектныя паўзы, спёка, адрэналін, дуэль. Балет куляў, стоеная іронія, годнасць. Справядлівасць і тэстастэрон.

Чыстае і абсалютнае кіно.

І пранізліва-лірычная музыка Эніё Марыконэ, які вучыўся з Леонэ ў адным класе — і якога рэжысёр баяўся запрашаць на карціну. Але, на шчасце гледачоў ,— рызыкнуў.

Карціна дэманструецца на тэлеканале «Мір» 2 жніўня, у 20.00.

**Андрэй Расінскі**

На «Беларусьфільме» адбываецца кастынг актораў для новай стужкі Андрэя Кудзіненкі «Масакра».

# Міхалок сыграе пярэваратня?

«Масакра» — трагікамедыя жахаў, складзеная па аддаленых матывах аповесці «Локіс» Праспэра Мэрымэ. Дзеянне фільму перанесенае ў Беларусь пасля паўстання Каліноўскага.

Як паведаміў сцэнарыст карціны Аляксандр Качан, галоўную ролю графа Пазуркевіча — лютага ў гневе мядзведзя-пярэваратня — рэжысёр Андрэй Кудзіненка спачатку меркаваў аддаць расійскаму актору Аляксандру Дамагараву, але графа найхутчэй сыграе беларус. Сярод кандыдатураў называліся рок-музыка Сяргей Міхалок, акторы Павал Харланчук, Анатоль Кот, які сыграў у славутай «Акупацыі» Андрэя Кудзіненкі.

Захоўваецца інтрыга вакол выканаўцы галоўнай жаночай ролі. Імаверна, прыгажуню-нявесту графа Ганну Казіміраўну сыграе польская акторка. Ролю расійскага авантурыста Казанцава, які выдае сябе за навукоўца і заляцаецца да графавай абранніцы, магчыма, выканае адзін з маладых актораў, якія здымаліся ў «Розыгрышы» Кудзіненкі.




**Акторы Паліна Сыркіна і Раман Падаляка падчас кінапробаў.**

Адзін з самых каларытных персанажаў фільму — айцец Павал, засакрэчаны паўстанец. Ролю зухаватага бацюшкі, які па-майстэрску валодае і крыжом, і ружжом, прапанаваная Аляксандру Колбышаву, які сыграў партызана Штыркіна ў «Акупацыі».

Адна з «вісклівых» роляў пішацца спецыяльна пад Святлану Зелянкоўскую.

Роля расійскага генерала — культурнага акупанта — пасуе расійскаму актору Юрыю Кузняцову (таму, што граў Мухамора ў серыяле «Мянты»). Па ходзе фільму яго задзярэ мядзьведзь.

Роля вясковага музыкі зарэзерваваная за Лявонам Вольскім.

Роля вясковага музыкі зарэзерваваная за Лявонам Вольскім.

Рэжысёра праспешваюць, каб ён хутчэй зрабіў канчатковы адбор. Але Кудзіненка кажа: «Я хачу, каб акторы на ўсе ролі былі падабраныя дакладна». Здымкі фільму пачнуцца ўвосень.

**Андрэй Расінскі**

**ТЭЛЕПРАГРАМА НА 3–9 ЖНІЎНЯ**

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 3 жніўня, панядзелак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 12 серыя
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**20.05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.35** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Альгерд» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Норкі», камедыя, рэж. Ян Гржэбэйк, 1998 г., Чэхія.
**23.15** Аб'ектыў

### 4 жніўня, аўторак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 52 серыя
**19.55** Побач з намі
**20.15** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 18 серыя
**22.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.40** Аб'ектыў

### 5 жніўня, серада

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 1 серыя, рэж. Міраслаў Балайка, 1998 г., Чэхія.
*Камедыйны сямейны серыял. Кудрны — звычайная гарадская сям'я: мама-оптык, тата-праграміст ды іхныя дзеці — 12-гадовы Сцяпан, 6-гадовы Мацей і 15-гадовая Элішка, якую клічуць Эліс. А таксама бабуля, маміна матуля і татава цешча, — да непрыемнасці кемлівая старая дама, прыкаваная да інваліднага вазка. І гэтай гарадской сям'і нечакана ў спадчыну дастаецца вясковая сядзіба дзядзькі Губэрта. Бывай, казінае малако з крамы і саматужна выгадаваныя памідоры! — захапляецца маці, прыхільніца здаровага харчавання. Сыны цешацца думкаю пра свойскую жывёлу, бацьку вабіць ідылія жыцця на прыродзе. Супраць зменаў выступаюць толькі Элішка і бабуля. Але ж сямейны маёнтак выглядае так прывабна...*
**19.35** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 2 серыя
**20.05** Хто ёсць кім: Кастусь Шыдлоўскі
**20.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Сэ ля ві», маст. фільм, рэж. Жан-П'ер Амеры, 2001 г., Францыя.
*Псіхалагічная драма. Дзмітрый трапляе ў шпіталь для цяжкахворых, дзе знаёміцца з валанцёркаю Сюзан. Расчараваны і пакрыўджаны на цэлы свет, ён пасябраваў з ёю і стаў больш чулы да іншых пацыентаў. Тым часам узаемаадносіны паміж героямі ўскладняюцца ўсё больш...*
**23.05** Аб'ектыў

### 6 жніўня, чацвер

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 3 серыя
**19.35** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 4 серыя
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Плямёны» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Беларускі лес», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**21.50** Форум (ток-шоў): «Шлюб па разліку»
**22.40** Аб'ектыў

### 7 жніўня, пятніца

**19.00** Аб'ектыў
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Музычныя партызаны», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбіньскі, 2007 г., Польшча
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў, 6 серыя: «Фінансавы крызіс»
**20.15** Побач з намі
**20.35** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Усяслаў Чарадзей» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Дырыжор», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1979 г., Польшча.
**22.55** Аб'ектыў

### 8 жніўня, субота

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** МакраФон: «Be Free—2008», фестываль, ч. 5: выступ гурта «Крама»
**19.45** Чалавек-эпоха: «Доўгі цень Чэ Гевары», дак. фільм, рэж. Вільфрыд Гёйсман, 2007 г., Нямеччына
**20.40** «Бульбаны», мультсерыял
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.40** «Дэтэрмінатар», серыял: 5 серыя
**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22.50** Аб'ектыў

### 9 жніўня, нядзеля

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 13 серыя
**20.05** МакраФон: «Minsk-Mixt—2008»: ч. 5. Канцэрт гурта «B:N:»
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Я бачыла «Рассвет» (Widziaiam świt), дак. фільм, рэж. Мар'я Вернікоўска (Maria Wiernikowska), 2000 г., Польшча
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: «Мачука», маст. фільм, рэж. Андрэс Вуд, 2004 г., Чылі—Іспанія.
*Чылі, 1973 год. Гансала Інфантэ і Пэдра Мачука — 11-гадовыя хлапчукі з Сант'яга. Першы жыве ў багатым раёне, другі — у сціплым паселішчы нелегальных перасяленцаў, якое ўзнікла непадалёк. Іхныя жыццёвыя шляхі скрыжоўваюцца ў касцельным коледжы святога Патрыка, дзе рэктар — айцец Макенрой — распачынае праграму сацыяльнай інтэграцыі для дзяцей з бедных сем'яў. На фоне бурных палітычных падзеяў таго часу сутыкаюцца два светапогляды, падзеленыя нябачным мурам, які спрабуюць разбурыць тыя, хто імкнецца да здзяйснення рэвалюцыйных мараў і надзеяў эпохі...*
*У 2005 г. стужка намінавалася на прэмію «Оскар» як адзін з найлепшых замежных фільмаў, атрымаў прэмію Гоі (Іспанія) і «Срэбнага Арыэля» (Мексіка) як найлепшы лацінаамерыканскі фільм году.*



# Вялікі патоп

**Залевы, залевы, залевы. Яны ідуць бясконца, наводзячы на шалёную думку — ці не пачаўся новы сусветны патоп? Фельетон Лёліка Ушкіна.**

Цэнтр Мінску. Тут стаіць каўчэг. Каля трапу вялікая чарга. Чыноўнік уважліва сочыць, каб на борт не трапіў які заяц.

Падыходзяць жанчына і мужчына.

**Чыноўнік:** Вы хто?

**Мужчына:** Пухавіцкія забойцы.

**Чыноўнік:** Так, пашукаем вас у спісе пасажыраў (чытаючы спіс): псіхолаг, прынц, практолаг, пухавіцкі забойца... Ага, ёсць! Добра. Наступны.

Падыходзіць наступная пара.

**Мужчына:** Мы прадстаўнікі электарату .

**Чыноўнік:** Так, глядзім у спіс. Ёсць. На борт, пліз. Стоп. А што гэта ў вас у рукзаку? Пладова-ягадны напой «Садочак»? Вы чыталі інструкцыі? Там жа ясна напісана — з сабою браць не больш за літр. Так, я разумею, што вандраваць 40 дзён. Не паложана...

**Мужчына** (звяртаючыся да жанчыны)**:** Слухай, можа, нахран гэты каўчэг? Пайшлі, яшчэ паспеем узяць.

**Чыноўнік:** Пачакайце! Як жа так? Вы не можаце адмовіцца... Ладна. Толькі піць выключна ў каютах.

Мужчына і жанчына падымаюцца на палубу.

**Чыноўнік** (сам сабе)**:** Парушэнне, а што рабіць: без электарату мы не адбудуем моцную і квітнеючую Беларусь.

Чуецца першы гудок.

Падыходзіць мужчына.

**Чыноўнік:** А ты чаго адзін? Цытую дырэктыву «Аб патопе»: на каўчэг будуць узятыя па два найлепшыя прадстаўнікі кожнай прафесіі, каб пасля патопу не толькі развязаць дэмаграфічнае пытанне, але і захаваць працоўныя традыцыі.

**Мужчына:** Справа ў тым, што я драпавы берэт, а драпавых берэтаў у спадніцах ніколі не было.

**Чыноўнік:** М-да, сітуацыя. А ў вас ёсць нейкі сябра, які таксама ўладальнік берэта?

**Мужчына:** Ну ясна! Братэла мой! Разам на Каўказе зараблялі. Васем завуць.

**Чыноўнік:** Супер! Мяняйце яму пол. Возьмем як Васіліну.

Мужчына збягае. Гучыць другі гудок.

Да чыноўніка падыходзіць яшчэ адна пара.

**Мужчына:** Здарылася нейкая памылка. Мы — найлепшыя знаўцы дзяржаўнай ідэалогіі. Шматвектарнасць, стабільнасць, бюракратыя не пройдзе і ўсё такое. Нас спачатку абралі, а потым чамусьці выкраслілі.

**Чыноўнік:** Так. Справа ў тым, што на каўчэг бяруць толькі найлепшых. Нашто ім мазгі пудрыць. Замест вас мы ўзялі парачку байкераў.

**Мужчына і жанчына:** Злітуйцеся! Мы не хочам паміраць.

У чыноўніка звоніць мабільнік.

**Чыноўнік:** Так, Ной Рыгоравіч, слухаю. Пасадка амаль завершаная. Што? Навошта апазіцыянераў? А каб, калі што якое, было на каго... Супер ідэя! Тым больш што ў мяне ўжо ёсць кандыдатуры. Слухаюся! (звяртаючыся да ідэолагаў). Гэй, вы! Нам тут трэба два нячэсныя. Калі згодныя, шуруйце на карабель.

Мужчына і жанчына, скандуючы «Не — наменклатурнай прыватызацыі!», бягуць па трапе.

Чуецца трэці гудок.

## ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Шок: унікальную царкву вычварылі еўрарамонтам

**Шыкоўны помнік драўлянага дойлідства ў Івацэвіцкім раёне патынкавалі, у вокны ўставілі шклопакеты, на даху з'явіліся купалы-цыбуліны, уваход нарасцілі з выкарыстаннем сілікатных блокаў.**

Крыжаўзвіжанская царква ў вёсцы Гошчава занесеная ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцяў. Гэтая ладная, прысадзістая, але дзівосна гарманічная цэркаўка была збудаваная ў 1838 годзе. Бачыла войны, бачыла Саветы. Выстаяла. Сёлета царкву вырашылі адрамантаваць. Добрая задума — немалады ж будынак. Але што за рамонт робяць з далікатным старым дрэвам?

Помнік драўлянага дойлідства патынкавалі. У вокны ўставілі шклопакеты. На даху з'явіліся купалы-цыбуліны ў маскоўскім стылі. Больш за тое, адзін купал-цыбуліна ўвогуле паўстаў там, дзе яго не было. Тамбур нарасцілі з выкарыстаннем сілікатных блокаў. А ад порціка з падвойнымі фігурнымі калонамі, што так густоўна вылучаў галоўны ўваход, не засталося і следу. Што і гаварыць пра такую драбніцу як паўцыркульныя вокны з разнымі ліштвамі, дзякуючы якім царква нібы жывая пазірала на кожнага, хто падыходзіў да яе з фасаду. Далоў і іх.

У ходзе рамонту «непапраўна змяняецца яе выгляд, канструкцыі, мастацка-архітэктурнае аздабленне, што з'яўляецца парушэннем шэрагу артыкулаў Закону «Аб ахове гістарычна-культурнай спадчыны», — піша ў звароце да Міністэрства культуры старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон Астаповіч. Ён адзначае, што «практыка несанкцыянаваных працаў на гістарычна-культурных каштоўнасцях, змяненне іх канструкцый і выгляду, у некаторых выпадках знішчэнне помнікаў, на жаль, яшчэ сустракаецца ў Беларусі». Перашкодзіць гэтаму павінная жорсткая пазіцыя Міністэрства культуры, лічыць Астаповіч. З адпаведным зваротам і хадайніцтвам аб прыцягненні вінаватых да крымінальнай адказнасці ён звярнуўся таксама ў пракуратуру Івацэвіцкага раёну.

Ва Упраўленні па ахове гістарычна-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры заявілі, што праект рэканструкцыі царквы ў Гошчаве не ўзгадняўся з Мінкультуры.

У Стайкаўскім сельсавеце, да якога належыць вёска Гошчава, ад каментароў адмовіліся, параіўшы звяртацца наўпрост да святара айца Аляксандра. Але адшукаць яго не ўдалося. «Цяжка нешта на гэтую тэму каментаваць», — кажа галоўны архітэктар Івацэвіцкага раёну Святлана Грушык. Па яе словах, а. Аляксандр робіць рамонт самастойна. Знайшоў сабе спонсара, прыватную асобу, які яму і дапамагае. На пытанне, ці ўзгадняліся гэтыя працы з ёй як з галоўным архітэктарам раёну, быў адмоўны адказ.

**Сямён Печанко**



А.ДЫБОЎСКІ

**Царква да рамонту.**



GLOBUS.TUT.BY

**Царква пасля еўрарамонту.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ЗДЫМУ КВАТЭРУ**

**Два беларускамоўныя хлопцы** (не студэнты) здымуць двухпакаёвую кватэру ў Мінску. Своечасовасць аплаты і парадак гарантуем. Т.: (029) 756-12-18 (Алесь) і (029) 113-40-41 (Алег).

**Здыму 1-2 пакаёвую кватэру.** Студэнт. Т.: (029)744-01-55 ці marozau@yandex.ru.

**Здыму 2-пакаёвую кватэру** ў Першамайскім або Савецкім раёне Мінску. Не студэнт. (029) 584-01-05 (МТС), Аляксандр.

**ДОМ**

**Набуду хутар, дом, зямельны ўчастак** у Мінскім раёне, вобласці. Для сябе. Т. (029) 682-32-18

**ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ТРУСЯНЯТЫ**

**Прадаем** маленькіх дэкаратыўных трусянят. Т.: (029) 577-78-07, (029) 677-29-34

**СПАЧУВАННІ**

**Сацыял-дэмакраты гораду Магілёва глыбока смуткуюць** з прычыны трагічнай смерці сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) Сяргея Гуркова, якая наступіла на 34-м годзе жыцця, і выказваюць спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Масква.** З турмы ўцякло дванаццаць палітычных кабет. Разам з імі ўцякла і іх наглядчыца — Тарасава.

**«Наша Ніва». №28 і 29. 1909**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6070. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.07.2009.
Замова № 4051.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

## АНЕКДОТЫ

***

— Доктар, што самае складанае ў вашай працы?

— Даведацца, якая ў пацыента любімая страва.

— Навошта?

— Каб забараніць яе.

***

Беларускі эмігрант у ЗША (пачатак 1900-х): «Я паехаў у Амерыку, бо мне казалі, што там вуліцы забрукаваныя золатам. Калі сюды прыехаў, я дазнаўся тры рэчы: па-першае, на вуліцах не было ніякага золата, па-другое, яны ўвогуле не былі забрукаваныя, па-трэцяе, усе чакалі, што якраз я і павінен іх брукаваць».

***

З законаў Хамурапі: Падчас разводу з усімі жонкамі муж атрымлівае 1/2, 1/3, 1/4, 1/5 сумесна нажытай маёмасці ў залежнасці ад колькасці жонак. Падчас разводу не з усімі жонкамі муж не атрымлівае нічога, бо розлічыць яго долю сучасная навука не ў стане.